ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 37 (1111) 14 верасня 2013 г.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

КВАДРАТ МІЦКЕВІЧА

У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы **распачаліся рэпетыцыі спектакля "Пан Тадэвуш" паводле паэмы Адама Міцкевіча.** Пастаноўка стане першай, ажыццёўленай на роднай сцэне калектыву.

На фота Юрыя ІВАНОВА — момант рэпетыцыі "Пана Тадэвуша". Пакуль Мікалай Пінігін і акцёры-купалаўцы кшталтуюць тэкст будучай пастаноўкі ў рэпетыцыйнай зале.

У Мінску сёння — Дзень горада!

С. 3, 9, 10
Рэакцыя на рэдакцыю: **што цікавіць чытачоў у Сеціве?**
С. 3
Ці займеем клуб і тэатр — **он-лайн?**
С. 5, 13
Нашы на Біенале!
С. 7, 9

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

"Круглы стол" "К": праблемы бібліятэчнай справы

А хто ты і дзе, "жывы" чытач?

Перад пачаткам "круглага стала", што прайшоў 9 верасня ў рэдакцыйным інфацэнтры, мы паспрачаліся з дырэктарам Дзяржынскай ЦБС Валянцінай Клімовіч наконт тэрміналогіі, якая вызначае сутнасць чытача. Мы, журналісты, паспрабавалі адстаяць сваё бачанне праблемы і давесці, што ледзь не штотыднёва адшукваем на вясковых абсягах актыўнага чытача. Валянціна Віктараўна, апелюючы да таго, што няма пакуль такой, строга вызначанай і занесенай у параграфы справаздачнасці, ацэнкі чытацкай цікавасці да кнігі, казала нам пра больш дарэчную дакладнасць словазлучэння "жывы чытач". Відавочная шматсэнсоўнасць: калі жывы, дык абавязкова — наяўны чытач, і пры гэтым — ні намёку на магчымыя "мёртвыя душы"... Словам, кожны з нас застаўся пры сваім.

Пра ўстановы, якія не сталі "вёсказахавальнымі" брэндамі

У рэдакцыі "К" сабраліся мінулым панядзелкам намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША, загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства НББ Марына ПШЫБЫТКА, дырэктар Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага Лідзія МАЛЬЦАВА, навуковы сакратар Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі Юрый МАКСІМЕНКА, загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна Паліна БУБІНА, дырэктар Дзяржынскай ЦБС Валянціна КЛІМОВІЧ, а рэдакцыйны "корпус" прадставілі журналісты Яўген РАГІН і Кастусь АНТАНОВІЧ.

Яўген РАГІН:

— Віншуем з Днём бібліятэк! Дзякуй, што вялікую справу робіце. Ды справа, зразумела, не абыходзіцца без праблем. Пра гэта і хацелася б пагутарыць. І давайце зробім асноўны ўпор на сельскія ўстановы. Абласныя ды раённыя бібліятэкі і базу маюць неблагую, і творчымі праектамі могуць пахваліцца. Вашы ж сельскія калегі такой паспяховасцю вызначаюцца не заўжды. Прынамсі, нашы выезды ў рэгіёны даюць падставы для такога сцвярджэння...

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Нашы бібліятэкі ды іх развіццё — люстраны адбітак жыцця грамадства ў цэлым. Мы ж, бібліятэкары, не існуём самі па сабе. Сельская бібліятэка — не выключэнне. Наша рэгіянальная палітыка наступная: бібліятэка будзе існаваць да таго часу, пакуль будзе патрэбная насельніцтву.

Яўген РАГІН:

— Напярэдадні "круглага стала", Валянціна Віктараўна, вы сказалі, што крызісу ЦБС не заўважаеце. Вы — праціўнік рэформ у бібліятэчнай справе?

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Змяняецца жыццё — змяняемся і мы. Інакш каму мы будзем патрэбны? Так, вялікага крызісу бібліятэчнай справы я не назіраю.

Яўген РАГІН:

— А крызіс у чытанні? Няўжо працэсы не ўзаемазвязаныя?

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Не пагаджуся з тым, што людзі сталі менш чытаць. Натуральна, праблем шмат, і іх неабходна вырашаць. На штомесячных сустрэчах з калегамі, дзе яны павышаюць кваліфікацыю, заўжды кажу: "Мы павінны даказваць сваю неабходнасць!" У выніку нашы ўстановы пазіцыянуюць сябе як інфармацыйныя, камунікатыўныя, сацыяльныя цэнтры, асяродкі адпачынку па інтарэсах. У сетцы — звыш сарака такіх аб'яднанняў. І да нас ідуць людзі. Задавольваюць чытацкія інтарэсы, шукаюць адказы на самыя розныя пытанні. Ды і мы ідзём у народ.

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— Цікава, а як часта сельскі бібліятэкар ходзіць да чытача?

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Калі інвалід ці пенсіянер прачытаў кнігі, ён звяртаецца да нас па тэлефоне. Мы прыходзім і замяняем літаратуру па яго замове... У Станькаве ёсць дзіцячы прытулак, і бібліятэкар не толькі заносіць сюды кнігі, але і ладзіць гутаркі, іншыя мерапрыемствы. А ў Энергетыках, у стацыянарнай бальніцы, у нас дзейнічае пункт кнігавыдачы...

(Працяг на стар. 4 — 6.)

Старэе вёска — знікаюць актыўныя чытачы. Бібліятэка пераўтвараецца ў пенсіянерскую прызбу. Ці ж гэта не патрэба ў рэформе ЦБС, звязанай з дэмаграфіяй? І чытачы ў горад імкнуцца, і бібліятэкары запалу не маюць…

Афіцыйна

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісаў Указ аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій 2012 года.

Так, у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры іх атрымалі наступныя асобы і творчыя калектывы. За спектакль "Пінская шляхта" паводле п'есы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча прэмія прысуджана Віктару Манаеву — артысту, вядучаму майстру сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, народнаму артысту Беларусі, выканаўцы ролі станавога прыстава Кручкова; Вользе Мацкевіч — мастаку-пастаноўшчыку, аўтару сцэнаграфіі спектакля; Андрэю Зубрычу — кампазітару, аўтару музычнага афармлення спектакля.

За выбітныя дасягненні вакальнага і выканальніцкага майстэрства, якія маюць высокую эстэтычную каштоўнасць ды робяць значны ўнёсак у нацыянальную культуру, прэмія прысуджана Ніне Шарубінай — артысту-вакалісту (салісту) — вядучаму майстру сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

За стварэнне шматпрофільнага Культурна-спартыўнага комплексу "Мінск-Арэна" прэміяй уганараваны супрацоўнікі рэспубліканскага праектнага ўнітарнага прадпрыемства "Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга "Інстытут Белдзяржпраект" Валерый Куцко — галоўны архітэктар праектаў архітэктурна-канструктарскай майстэрні, Уладзімір Будаеў — начальнік архітэктурна-канструктарскай майстэрні, Анатоль Шабалін — галоўны архітэктар.

■■■

Работнікі розных сфер удастоены дзяржаўных узнагарод. Як паведамляе Прэс-служба беларускага Лідара, адпаведны Указ падпісаў Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Так, вядучы майстар сцэны Тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Святлана Сухавей узнагароджана ордэнам Францыска Скарыны.

Больш як дзесяць чалавек уганараваны медалём Францыска Скарыны. Сярод іх — кіраўнік Творчых майстэрняў "Цэнтр сучасных мастацтваў" Віктар Альшэўскі, першы намеснік дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага Ігар Андрэеў, дырэктар — мастацкі кіраўнік Гродзенскай капэлы Уладзімір Борматаў, настаўнік сталічнай Дзяржаўнай харэаграфічнай школы мастацтваў № 1, балетмайстар узорнага ансамбля № 1 Станіслаў Дарохін, выкладчык Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа Ларыса Іконнікава, загадчык трупы оперы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Ніна Казлова, а таксама дырыжор гэтага тэатра Мікалай Калядка, артыст-вакаліст — вядучы майстар сцэны Эдуард Мартынюк, канцэртмайстар па класе вакалу Юлія Шчарбакова. Узнагароджаны таксама дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч, балетмайстар Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь "Ансамбль "Лялечкі" Абухаўскага цэнтра культуры і вольнага часу аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама Надзея Урукіна, артыст драмы вышэйшай катэгорыі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Юлія Шпілеўская.

Ганаровае званне "Народны артыст Беларусі" прысвоена артысту драмы, вядучаму майстру сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Зінаідзе Зубковай. Актрысы гэтага ж тэатра Алена Сідарава і Тамара Міронава атрымалі званне "Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь". Таксама гэтага ж звання ўдастоены артысты аркестра — вядучыя майстры сцэны Вялікага тэатра Рэгіна Саркісова і Вадзім Чайкоў.

Ганаровае званне "Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь" атрымалі прафесар кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Анатоль Арцімовіч і загадчык кафедры медных духавых і ўдарных інструментаў Акадэміі музыкі Мікалай Волкаў. Звання "Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь" удастоена дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская.

Падзея

Дыялогі з землякамі

Сёння стартуе X Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Першыя мерапрыемствы праходзяць у Дзень горада Мінска на сцэне Белдзяржфілармоніі.

Акрамя таго, учора ў сталіцы, пад патранатам Міністэрства культуры Беларусі, завяршылася Міжнародная канферэнцыя па пытаннях міжкультурнага дыялога і міжэтнічнага ўзаемадзеяння ў прасторы СНД, а сёння — пасяджэнне Кансультатыўнага савета па пытаннях беларусаў замежжа. Пытанні і прапановы, што агучваліся на пасяджэнні савета, — у наступным нумары.

На здымку: пад час пасяджэння.

Віншаванне

Шаноўныя сябры!

Прыміце шчырыя віншаванні з прафесійным святам — Днём бібліятэк!

Кніга для чалавека — заўсёды верны сябар і мудры настаўнік, які дорыць магчымасць дакрануцца да культурнай спадчыны стагоддзяў, дапамагае знайсці адказы на многія пытанні. У сучасным грамадстве, дзе інфармацыя з'яўляецца рухаючай сілай, бібліятэкі, іх каштоўныя калекцыі і сучасныя інфармацыйныя рэсурсы набываюць усё большае значэнне.

Сёння бібліятэкі — гэта шматфункцыянальныя ўстановы, якія паспяхова выконваюць інфармацыйную, сацыякультурную, адукацыйную, камунікатыўную функцыі. Гэта месца, дзе чалавек вучыцца думаць і разважаць, дзе адбываецца сацыялізацыя асобы, яе далучэнне да культурных каштоўнасцей. Бібліятэка — установа, дзейнасць якой традыцыйна садзейнічае падтрымцы, развіццю і папулярызацыі чытання.

Бібліятэчная справа ў Беларусі мае доўгую і багатую гісторыю, якая дае імпульс для развіцця ў сучасных умовах. У краіне дзейнічае шматгаліновая сетка, што забяспечвае агульнадаступнасць бібліятэчных паслуг і рознабаковыя інфармацыйныя патрэбы насельніцтва. Сёння сістэма бібліятэк Беларусі ўключае амаль 9,2 тысячы публічных і спецыяльных бібліятэк з агульным аб'ёмам фондаў звыш 200 мільёнаў экзэмпляраў.

Роля падзвіжніцкай і асветніцкай працы спецыялістаў бібліятэк відавочная. Сваёй нястомнай дзейнасцю вы захоўваеце культурную спадчыну Беларусі, актыўна ўдзельнічаеце ў працэсе фарміравання інфармацыйнага грамадства, выконваеце пачэсную місію выхавання інтэлектуальна моцнай нацыі. Кожны жыхар нашай краіны ўдзячны вам за старанне і любоў да вашай карыснай справы.

Жадаю кожнаму з вас невычэрпнай крыніцы творчасці і духоўнай моцы, асабістага шчасця і поспехаў ва ўсіх галінах вашага жыцця! Няхай у гэтае свята вы ў найбольшай ступені адчуеце гонар за сваю справу, прымножыце імкненне да далейшых дасягненняў, аптымізм і веру ў будучыню!

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ

Анонс

Пачынаем!

Сезон пачаты ва ўсіх музычна-тэатральных і канцэртных установах! Да Вялікага тэатра, які стартаваў раней за ўсіх, далучыліся Музычны і Белдзяржфілармонія.

У Вялікім на 81-ы сезон, які распачаўся балетам "Вітаўт" Вячаслава Кузняцова, запланавана ажно 12 прэм'ер і 15 найменняў, бо пэўныя аднаактоўкі злучаны. Навінкі — балеты "Шэсць танцаў" на музыку В.А. Моцарта, "Сем прыгажунь" Кара Караева, "Сем смяротных грахоў" нашага кампазітара Алега Хадоскі, "Падэ-катр" Ц.Пуні.

"Шэсць танцаў" — пастаноўка культавага харэографа Іржы Кіліяна з Нідэрландаў. А оперу "Пікавая дама" П.Чайкоўскага ўвасобіць балгарын Пламен Карталаў, які ўразіў летась сафійскай пастаноўкай "Зігфрыда" Р.Вагнера. Увогуле, падобных праектаў будзе шмат. Над "Лятучым Галандцам" Вагнера будзе працаваць нямецка-расійская каманда, а прэм'ера прымеркавана да IV Каляднага опернага форуму. "Рыгалета" Дж.Вердзі паўстане з эстонскім акцэнтам у рэжысуры і сцэнаграфіі. А галоўны рэжысёр нашага тэатра Міхаіл Панджавідзэ пасля шэрагу маштабных спектакляў ажыццявіць пастаноўкі ў Камернай зале імя Л.Александроўскай (оперы "Чалавечы голас" Ф.Пуленка і "Тэлефон" Дж.Меноці), а таксама на Малой сцэне (тут узнікне рэдакцыя "Галькі" С.Манюшкі, якая сумесціць дзве аўтарскія версіі).

Да нацыянальнай прэм'еры рыхтуецца Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр. 12 лістапада мы ўбачым мюзікл Уладзіміра Кандрусевіча "Соф'я Гальшанская". А напрыканцы года гэты тэатр пакажа новы балет "Тысяча і адна ноч" Ф.Амірава.

Філарманічны сезон знамянальны датамі некалькіх калектываў: 85 гадоў спаўняецца Акадэмічнаму сімфанічнаму аркестру, 40 — ансамблю "Харошкі", 20 — Камернаму хору, 10 — ансамблю народных інструментаў пад кіраўніцтвам Ігара Іванова. Адбудуцца канцэрты да 80-годдзя Беларускага саюза кампазітараў, 100-годдзя з дня нараджэння Анатоля Багатырова. У лістападзе пройдзе III Міжнародны конкурс выканаўцаў на струнных смычковых інструментах імя М.Ельскага. Фестывальную афішу адкрые ў кастрычніку VIII Міжнародны фестываль Юрыя Башмета, літаральна следам — 39-я "Беларуская музычная восень" разам з форумам "Беларусы свету", у лютым — у трэці раз "Уладзімір Співакоў запрашае", а потым — "Мінская вясна" і "Дуэцісіма".

А як гучна адкрывае сезон сімфанічны аркестр Акадэміі музыкі! 17 верасня ён выступае ў філармоніі — і адразу ж выпраўляецца ў Маскву, каб паўтарыць выбітную праграму (дырыжор — Аляксандр Анісімаў, салісты — выпускнікі БДАМ, а сёння музыканты Арцём Шышкоў і Вераніка Прадзед) на легендарнай сцэне Маскоўскай кансерваторыі імя П.Чайкоўскага, якая лічыцца адной з найпрэстыжных у свеце.

Акцэнт тыдня

Нехта мусіў прайграць...

Ілья СВІРЫН,
рэдактар аддзела газеты "Культура"

Рыцарскія імпрэзы даўно зарэкамендавалі сябе як самыя што ні ёсць масавыя святы. А запачаткаваў гэтую тэндэнцыю менавіта Фестываль сярэднявечнай культуры "Навагрудскі замак". Было тое трынаццаць гадоў таму. Сёлетні фэст, праведзены пасля трохгадовага перапынку, сабраў фенаменальна мала гледачоў. Раней лік ішоў на дзясяткі тысяч, цяпер — усяго на сотні. Арганізатары недаўмяваюць: чаму так атрымалася? Скептыкі ж нават загаманілі пра "крызіс жанру".

Па вялікім рахунку, прычыны ляжаць на паверхні. Варта толькі азнаёміцца з афішай на той самы ўік-энд 7 — 8 верасня. У ёй мы сустрэнем і фольк-фэст "Камяніца", які сёлета сабраў каля васьмі тысяч гледачоў, і вясёлы ды самабытны "Цукеркавы фэст" у Івянцы, што без рыцараў таксама не абыходзіцца, і яшчэ адну батальную рэканструкцыю, але ўжо з іншай эпохі, — танкавую бітву на комплексе "Лінія Сталіна". І добра б яшчэ, каб тыя імпрэзы былі расканцэнтраваны па розных кутках нашай не такой і малой краіны: шараговы жыхар Гомеля або Магілёва ў Навагрудак усё адно наўрад ці паедзе, бо гэта вельмі далёка. Дык не: усе згаданыя падзеі ладзіліся "ў сферы прыцягнення" Мінска ды былі разлічаны перадусім на турыста са сталіцы. Таму цалкам натуральна, што публіка папросту "распаўзлася" па розных месцах.

У такіх варунках нехта абавязкова мусіў прайграць. Сёлета ў гэтай ролі апынуўся менавіта найстарэйшы рыцарскі фэст, бо і рэкламы менш, і дабірацца складаней... Ды і традыцыя, на жаль, парушана: калі б "Навагрудскі замак" ладзіўся ў сваім першапачатковым тэмпарытме (раз на два гады), публіка на яго не забывалася б і чакала. А вось калі паўзы непрадказальна зацягваюцца...

Зрэшты, самае галоўнае пытанне тут у іншым: ці настолькі ўжо непазбежная гэтая канкурэнцыя? Няўжо на Беларусі так шмат яркіх турівэнтаў, што ім абавязкова даводзіцца ўтрапёна змагацца за гледача?

Можна проста пагартаць каляндар крыху назад ці наперад — і мы адразу ўбачым, што падобныя "разнасолы" чакаюць турыста далёка не ў кожныя выхадныя. І калі раўнамерна расцягнуць тыя падзеі па ўсім "цёплым перыядзе" (з мая па кастрычнік), задаволены будуць усе: і арганізатары, і гледачы, і ўдзельнікі.

Пытанне ў іншым: як гэта зрабіць? Нейкай інстытуцыі, якая сёння каардынавала б івэнт-турызм (хаця б нават на кансультатыўным узроўні), у нас пакуль што няма. Гутарка пра стварэнне календара культурных падзей на год стала ўжо "притчей во языцех". Ён ужо робіцца стараннямі Нацыянальнага агенцтва па турызме, аднак сабраную напрыканцы мінулага года інфармацыю трэба абавязкова правяраць: усяго за некалькі месяцаў яна мае звычку "састарвацца". Прыкладам, той самы сёлетні "Навагрудскі замак" анансаваўся на ліпень ды быў лагічна прымеркаваны да ўгодкаў каранацыі першага князя ВКЛ — Міндоўга.

Здавалася б, можна ўрэчаісніць вельмі просты алгарытм. Прыкладам, мы тут у сваім n-скім раёне задумалі правесці ў верасні грандыёзны Фэст часныка ды сала. Вызначаем дату, паведамляем яе ў папярэднім снежні, скажам, у Нацыянальнае агенцтва па турызме, — і даведваемся там, што акурат напярэдадні прыйшла інфармацыя аб правядзенні ў той самы дзень Турніру бульбы ды шкваркі. Натуральна, лепш нам будзе загадзя перанесціся на які тыдзень: столькі калорый спажыўцы адразу не адолеюць.

Пытанне толькі ў тым, калі такія немудрагелістыя тэхналогіі запрацуюць…

Культурны твітар: мы ў свеце

Італія

Выступленні Мінскага камернага хору "Паліфоніка" пройдуць у італьянскім аўтаномным рэгіёне Сардзінія ў рамках XXII Міжнароднага фестывалю харавой музыкі "Concordia Vocis". Цягам трох дзён адбудуцца канцэрты ў сярэднявечным горадзе Іглесіяс, у Тартолі ды ў Кальяры — сталіцы Сардзініі. Увазе гледачоў прадставяць творы беларускай народнай музыкі як царкоўнага, так і свецкага характару.

Расія

У Пензе завяршыў сваю работу VI Міжнародны фестываль сучаснага мастацтва і творчых тэхналогій. У мерапрыемстве бралі ўдзел дызайнеры, скульптары, мастакі амаль з 30 краін, у тым ліку з Рэспублікі Беларусь. Фестываль праходзіў па ініцыятыве Цэнтра сучаснага мастацтва і культуры Пензенскай вобласці.

Мінская галерэя сучаснага мастацтва "Ў" прыме ўдзел у праекце "NEW PLATFORM" у рамках XVII Міжнароднага мастацкага кірмашу "АРТ Масква" ў Цэнтральным доме мастака. У рамках праекта выставяць работы Міхаіла Гуліна, Аляксея Лунёва, Сяргея Шабохіна, Антаніны Слабодчыкавай ды іншых.

Сербія

Мінскі Свята-Елісавецінскі манастыр возьме ўдзел у 58-й Міжнароднай кніжнай выстаўцы, якая з 20 па 27 кастрычніка пройдзе ў Бялградзе. З 2009 года стэнд упрыгожвае гэты найбуйнейшы на Балканах кніжны форум.

Малдова

Работы беларускага мастака Вячаслава Ігнаценкі экспануюцца ў Бюро міжэтнічных адносін у Кішынёве. Экспазіцыя "Дарога" прадстаўлена амаль трыццаццю палотнамі, створанымі ў розныя перыяды працы майстра. Выстаўка прысвечана Дню незалежнасці Рэспублікі Малдова.

Падрыхтавала Вольга НАВІЦКАЯ

Фотасюжэт нумара



Мінскія вокны

З нагоды Дня горада, які сталіца святкуе сёння, публікуем фота з цыкла "Вокны" вядомага фотамастака Георгія Ліхтаровіча.







Трэба абмеркаваць!

Ці патрэбен у Беларусі тэлеканал з этнамузыкай?

У эпоху лічбавага тэлебачання знайсці "свой" канал — не праблема. Кабельныя аператары сёння прапаноўваюць тэлеканалы, прысвечаныя фільмам, тэлесерыялам, навуцы і тэхналогіям, самым разнастайным хобі, кшталту рыбалкі і садаводства. Вядома, сярод гэтага мора маюцца і музычныя, толькі "круцяць" там кліпы і выступленні ад эстрадных выканаўцаў да альтэрнатыўных калектываў. Тым часам так званае этна (а насамрэч — традыцыйная выканальніцкая культура) вымушана заставацца ў пэўнай рэзервацыі. Наколькі ж актуальным і запатрабаваным будзе стварэнне тэлеканала, аснову якога складзе народнае спеўнае мастацтва?

Алег ЦІХАНАЎ, прадзюсар музычных стартапаў, кліпмейкер:

— Музычны тэлеканал, скіраваны на этнічную музыку, — справа вельмі цікавая. Але, як і любы іншы, такі тэлеканал павінен існаваць ды развівацца за чыйсьці кошт. Перакананы, стварэнне "этнаканала" — гэта вялікія інвестыцыі: хутчэй, не ў бізнес, а ў сябе, у родную беларускую культуру. Па вялікім рахунку, гэта — мецэнацтва. А вось знайсці такога мецэната — справа не з лёгкіх. І тым не менш, упэўнены: нават з такога, досыць спецыфічнага, тэлеканала можна мець прыбытак, які будзе залежаць, найперш, ад маркетынгу, таксама як і ад якасці саміх перадач, музычнага кантэнту. Гэта мусіць быць прадукт, арыентаваны на шырокую аўдыторыю, у тым ліку сучаснага гарадскога жыхара, які сёння вельмі далёкі ад народнай культуры. Наколькі такі канал будзе запатрабаваны (калі, канешне ж, ён з'явіцца), пакажа час. Калі ж казаць у цэлым, то поспех яго залежыць ад мэт і задач стваральнікаў, а таксама ад якаснага кіравання…

Кастусь АНТАНОВІЧ, рэдактар аддзела газеты "Культура":

— Можна шмат спрачацца наконт мэтазгоднасці стварэння "народнага" тэлеканала, але найперш хочацца згадаць адзін факт. У Румыніі на сённяшні дзень працуюць два рэспубліканскія тэлеканалы: "Этна" і "Фаварыт ТБ". У аснове іх палітыкі вяшчання (дарэчы, яны транслююцца кругласутачна) — народная музыка і традыцыйнае мастацтва. На кожным з іх можна ўбачыць канцэртныя запісы фестываляў народнай культуры, кліпы (няхай сабе і без тэхнічных "наваротаў") маладых, пачынаючых і прафесійных выканаўцаў. Маюцца ў праграме і інтэрактыўныя ток-шоу, і кулінарныя перадачы (вядома ж, прысвечаныя традыцыйным стравам). Цікава, што адна з самых запатрабаваных праграм — музыка па заяўках. Да слова, паслуга — платная і каштуе прыкладна адзін еўра. Улічваючы, што перадача — пастаянная, можна меркаваць, што людзі гатовы аддаць свае "кроўныя" за народную творчасць. На гэтых, скажам шчыра, сацыяльных тэлеканалах маецца і "лыжка дзёгцю" — традыцыйныя і для нас "крамы на канапе", якія сумарна ў суткі займаюць у эфіры некалькі гадзін. Нічога дзіўнага: каналам трэба выжываць. Але самае галоўнае і, нагэўна, дзіўнае — рэкламадаўцы не цураюцца, здавалася б, не самых топавых этнаканалаў, а значыць, гатовы падтрымаць на ўзаемавыгадных умовах сваю культуру…

Рэакцыя на рэдакцыю: якія артыкулы газеты чытачы каментуюць у сацыяльных сетках?

"Быхаў запрашае!"

Oleg Chechenev:

— Лепш такія роспісы з нацыянальнай гісторыі, чым абязлічаныя квадрацікі на сценах…

"Вялікая беларуская сцяна перад "новай драмай" (частка III)

Andriej Moskwin:

— Нешта мне зрабілася кепска ад усяго гэтага… І гэтыя людзі ўзначальваюць тэатры? Дык у якім асяроддзі яны жывуць?..

Nikolay Rudkovski:

— Андрэй, ты яшчэ папярэднія выпускі не чытаў!..

"Заўтра не прыйдзе ніколі?"

Olga Novikova:

— Ну, пра Шылава — так, пагаджаюся… А вось з музыкай… Сяргей пакуль яшчэ ў шкалярах. Ну, калі падабаецца… Але ж не ўсе такія геніі, першаадкрывальнікаў ніколі шмат не было! Колькі моцартаў ведае свет? Наперадзе ідуць адзінкі, вось толькі (і гэта сапраўды закон) ім патрэбна падтрымка. Цудоўна ўжо тое, што ў нас вырасла плеяда проста выбітных выканаўцаў (я маю на ўвазе, вядома, класічныя формы твораў, а вось з джазам у нас не ўсё так выдатна). Лепшыя рвуцца адсюль, бо хто можа іх сур'ёзна ацаніць, калі да нас возяць такіх, як Селена Гомес ці Філіп Кіркораў?.. Урэшце, усё гэта я пра тое, што музыка сучасная — не толькі рок…

"Сучасны бібліятэкар: шэрая мышка ці Флін Карсэн?"

Ales Susha:

— Адкуль гэтулькі песімізму сярод нашых калег?! Карацей, прынцыпова не згодзен з ацэнкамі. Ёсць, напрыклад, фільмы з пазітыўным вобразам бібліятэкара як адукаванай, а часам і авантурнай асобы. Не шэдэўр, канешне ж, але прыклад: фільм "The Librarian: Quest for the Spear" ("Бібліятэкар: у пошуках Капʼя (Капʼя Лёсу)").

Юрий Максименко:

— Дык пра яго ж і ішла гаворка: Флін Карсэн!..

Ales Susha:

— Дык ён жа не адзіны! Ёсць і іншыя прыклады. Часам бібліятэкары з'яўляюцца галоўнымі героямі і тады становяцца "супербібліятэкарамі". Нярэдка яны робяць добрую справу для галоўных герояў, дапамагаюць ім. Згадайма хаця б нармальных бібліятэкараў ва "Уцёках з Шоўшэнка" ці "Уцёках з Алькатраса". Але ўсе мы людзі, таму і з бібліятэкараў часам выходзяць антыгероі, нават крыважэрцы. Дарэчы, цікавы і шматбаковы аналіз вобраза нашых калег зрабіў Юрый Мацвееў у артыкуле "Як у кіно? Бібліятэкі і бібліятэкары ў кінафільмах"…

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77,
альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце
на facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kultura_by!

Дзяжурны па нумары

Ці патрэбна гэтая памяць?



Барыс КРЭПАК,
рэдактар аддзела газеты "Культура"

У снежні адбудзецца чарговы, XXI З'езд Беларускага саюза мастакоў. Плануецца, што ён пройдзе цягам аднаго дня, і я думаю, што, улічваючы выбары новага кіраўніцтва, гаворкі пра надзённыя пытанні сучаснага выяўленчага мастацтва чакаць не давядзецца. Бо самая галоўная праблема дня сённяшняга для мастакоў, зыходзячы з сацыяльна-эканамічных рэалій, — як захаваць творчы Саюз наогул. Але тое — асобная тэма, і мы да яе яшчэ вернемся пазней.

А пакуль хачу згадаць мінулае. 75 гадоў таму, 9 снежня 1938-га, адбыўся I З'езд мастакоў Беларусі. Тагачасны першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка на гэтым з'ездзе заклікаў беларускіх мастакоў "…у самы найбліжэйшы час даць творы, якія ўзбагацілі б мастацтва ўсяго Савецкага Саюза". Ён адзначыў, што "…найгалоўнай умовай далейшых творчых поспехаў нашых мастакоў з'яўляецца іх ідэйнае ўзбагачэнне, авалоданне тэорыяй марксізму-ленінізму, вывучэнне найвялікшага дакумента нашай партыі — Кароткага курса гісторыі ВКП(б)…". Сказана — зроблена. Паводле слоў аднаго з крытыкаў, перадваенныя гады "…з'явіліся якасным скачком у развіцці выяўленчага мастацтва Беларусі, перыядам творчага росту <…>. У творчасці мастакоў замацоўваецца метад сацыялістычнага рэалізму, тэматычная карціна напаўняецца грамадска-гістарычным сэнсам…".

Не ведаю, як наконт "якаснага скачка", але зразумела адно: беларуская культура ў другой палове 30-х гадоў трапіла ў ціскі жорсткай цэнтралізацыі і дыктату. Мастацтву быў навязаны сацрэалізм без уліку шматвяковых традыцый, індывідуальнасці мастака, духоўнага вопыту мінуўшчыны. Урэшце, гэта вядома сёння ўсім, хто цікавіцца гісторыяй нашай культуры. Але быў такі час, такая эпоха, калі расцвіталі наступныя сентэнцыі: "іезуіт Скарына", "дробнабуржуазны бунтар" і "герой польскай шляхты" Каліноўскі"; "нацыяналістычныя тэндэнцыі" ішлі ад беларускіх цэркваў, Скарынавай "Бібліі", слуцкіх паясоў. "Фармалізм", "экспрэсіянізм", "буржуазную эстэтызацыю" знаходзілі ў творчасці нават такіх рэалістаў, як Ахрэмчык, Тычына, Волкаў, Кругер, а таксама Філіповіч, Грубэ, Семашкевіч, Мінін, мастацтвазнаўцы Шчакаціхіна. Асаблівага поспеху ў пошуках "контррэвалюцыі" ў мастацтве і літаратуры дасягнулі "вульгарныя сацыёлагі" І.Гурскі, А.Касцялянскі, Л.Бэндэ, Я.Ліманоўскі, С.Вольфсан, А.Канакоцін, І.Барашка ды шмат іншых "змагароў" за сацрэалізм, за "чысціню генеральнай лініі партыі ў справе далейшага бальшавісцкага разгортвання культуры і мастацтва".

У снежні адбудзецца чарговы, XXI З'езд Беларускага саюза мастакоў. Плануецца, што ён пройдзе цягам аднаго дня, і я думаю, што, улічваючы выбары новага кіраўніцтва, гаворкі пра надзённыя пытанні сучаснага выяўленчага мастацтва чакаць не давядзецца.

Спецыялістам вядомы ліст Панамарэнкі "Пра беларускую мову, літаратуру і пісьменікаў" — ад 21 лістапада 1938 года Сталіну, дзе ён у самай катэгарычнай форме заклікаў "...решительно очистить литературу от произведений с национал-фашистской контрабандой <…>, поднять литературную, преданную молодежь, освежить литературу, укрепить руководство Союза писателей. В отношении Янки Купалы, Якуба Коласа, Бровко, Глебки, Крапивы, Бядули, Вольского, Аксельрода и др. членов этой «могучей кучки», узурпировавшей представительство от Белорусской литературы всюду, в том числе и за рубежом, людей, творческая авторитетность которых непомерно раздута, проводивших лично всю описанную выше вражескую работу, имеются многочисленные показания разоблаченных и арестованных врагов, изобличающие их вплоть до связей с польской дефензивой. В отношении Янки Купалы имеется 41 показание, в большинстве прямые; Якуба Коласа — 31 показание; Крапивы — 12 показаний, и так далее. По количеству и качеству изобличающего материала, а также по известным нам фактам их работы, они, безусловно, подлежат аресту и суду как враги народа…".

Як кажуць, каментарыі залішнія. І пра гэта я думаю, калі праходжу па сённяшніх мінскіх вуліцах імя таго ж Панамарэнкі ці Гурскага, не кажучы пра вуліцы, названыя імёнамі тых, хто, мякка кажучы, далёка не заслугоўвае такога нашага нацыянальнага гонару: ад Калініна, Валадарскага, Свярдлова да Мяснікяна (Мяснікова), Фабрыцыуса, Кнорына, Цэткін, Люксембург, Крупскай, Катоўскага ды іншых "крутых" рэвалюцыянераў і ваеначальнікаў.

Так што абсалютна слушна паўстала на апошнім Прэзідыуме Саюза мастакоў пытанне аб прысваенні імя Міхаіла Савіцкага адной з вуліц, у прыватнасці, сталіцы. Але гаворка не толькі пра гэтую Асобу, а і пра іншых выбітных творцаў нацыянальнай культуры.

Ці патрэбна ведаць пра тое, што я напісаў? Мо для каго і не патрэбна вяртацца ў такое мінулае. Навошта, калі сённяшніх праблем — па горла? Але асабіста для мяне — патрэбна, бо, на жаль, гісторыя мае звычку паўтарацца...

Што ж да наступнага З'езда нашых мастакоў, то, дзякаваць богу, час моцнага ідэалагічнага прэса на творчасць даўно прайшоў. Справа засталася толькі за індывідуальным талентам, мастакоўскім сумленнем і духоўным пачуццём таго, у якой краіне ты жывеш…

"Круглы стол" "К": праблемы бібліятэчнай справы

Пра ўстановы, якія не сталі "вёсказахавальнымі" брэндамі

(Працяг. Пачатак на стар. 1.)

Яўген РАГІН:

— Усё гэта цудоўна, але давайце усё ж агучваць тыя праблемы, што замінаюць развіццю справы.

Алесь СУША:

— Пагаджуся, што асаблівага крызісу ў чытанні няма. Яно проста трансфармуецца. Днямі ў Сінгапуры скончыў работу Міжнародны кангрэс бібліятэк і бібліятэчных асацыяцый. Дык вось, там даволі пэўна засведчылі, што цягам бліжэйшых сямі-васьмі гадоў у агульнасусветным маштабе жыхары любога рэгіёна планеты будуць мець сучасныя сродкі доступу да інфармацыі ў віртуальным асяроддзі, найперш — мабільныя прыстасаванні. Праблемы доступу на сёння практычна няма і ў беларускай вёсцы. І нам неабходна працаваць з улікам гэтых тэндэнцый. Задача бліжэйшага часу — выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій у дзейнасці бібліятэк...

Яўген РАГІН:

— Даруйце, не магу не перабіць... Давайце апусцімся на вясковую глебу. Нават не ва ўсіх установах нашых аграгарадкоў ёсць

Юрый Максіменка.

Валянціна Клімовіч.

Лідзія Мальцава.

А хто ты і дзе,

камп'ютары... Калі цягам некалькіх камандзіровак мы наведваем сельскія бібліятэкі, усе яны і па выглядзе, і па змесце зліваюцца ў штосьці адзінае, сярэднестатыстычнае і не выклікаюць пачуцця журналісцкай сустрэчы з крэатывам, які можна было б прадэманстраваць рэспубліцы. Натуральна, не ўсе сельскія ўстановы такія. І можна казаць пра розныя бібліятэчныя праекты. Але ж мы абмяркоўваем праблемы і шляхі іх вырашэння... Лічу, Магілёўшчына тут крочыць упэўнена. Мясцовы каледж выпускае бібліятэкараў з клубнай адукацыяй, здольных на рэалізацыю маркетынгавых акцый. У бібліятэках аграгарадкоў вобласці — па некалькі камп'ютараў, ёсць яны і ў сельскіх установах…

Алесь СУША:

— Так, камп'ютары мае больш за 80 працэнтаў аграгарадоцкіх бібліятэк. Большасць — з доступам у Інтэрнэт. Да 2015-га праблема павінна быць вырашана цалкам... Калі мы створым нармальную сістэму бібліяграфічнага забеспячэння праз электронныя каталогі, праз базу даных, калі "ўзброім" сельскія ўстановы поўнымі тэкстамі рэцэнзаваных дакументаў, тады зможам сцвярджаць, што вясковыя бібліятэчныя магчымасці не адрозніваюцца ад гарадскіх. Электронны каталог усіх ці асноўных устаноў краіны зменшыць дубліраванне ў працы: пры зводным рэсурсе не трэба апісваць тое, што ўжо апісана.

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— Але ж інфармацыйная няроўнасць пакуль існуе...

Алесь СУША:

— Вось яе і імкнёмся ліквідаваць. Адна справа — паставіць камп'ютар з выхадам у Інтэрнэт, і іншая — адабраць патрэбную інфармацыю з высокім узроўнем даверу.

Яўген РАГІН:

— Мы, напэўна, акцэнт робім цяпер на кваліфікацыі бібліятэкара? Ды я зноў пра тое, што ёсць... Існуюць, што прыхоўваць, сельскія бібліятэкі, дзе, па словах работнікаў, за дзень не бывае ніводнага чытача.

Існуюць, што прыхоўваць, сельскія бібліятэкі, дзе, па словах работнікаў, за дзень не бывае ніводнага чытача. Нават кам'ютары сітуацыю не ратуюць.

Нават кам'ютары сітуацыю не ратуюць. Пытаемся ў такіх установах: "Як вы ўласную будучыню бачыце?" Адказваюць: "Як у нас ці не ўся вёска збіралася, так і будзе збірацца. Тэлевізар з дому прыносім, гарбату п'ём, пра жыццё гамонім". Пра такія цэнтры сацыяльных стасункаў сёння гаварылася ўжо. І сям-там падобныя ўстановы становяцца вясковымі брэндамі не праз праекты, скіраваныя на папулярызацыю чытання, а праз чалавечую еднасць. У нашых вёсках — усё менш моладзі. Старэе вёска — знікаюць актыўныя чытачы. А бібліятэка пераўтвараецца ў пенсіянерскую прызбу. Ці ж гэта не патрэба ў рэформе ЦБС, звязаная з дэмаграфічнай сітуацыяй? І чытачы ў горад імкнуцца, і бібліятэкары адпаведнага прафесійнага запалу не маюць…

Марына ПШЫБЫТКА:

— Вось вы кажаце, што ў шэрагу бібліятэк вам нецікава і сумна. А давайце я вам знайду ў такіх установах і цікавае, і нясумнае! Проста, вы кепскае бачыце, а я — добрае…

Яўген РАГІН:

— Мы не супраць: будзем разам выязджаць. Але ж паверце, і мы добрае шукаем без стомы, бо асноўная журналісцкая задача — перадавы вопыт папулярызаваць. І ці ж наша віна, што пэўныя бібліятэкары, нас пабачыўшы, і слова сказаць не могуць. Якія яны пасля гэтага маркетолагі, псіхолагі і піяршчыкі сваіх здабыткаў?

Юрый МАКСІМЕНКА:

— Безумоўна, кадравая сітуацыя наўпрост уплывае на тое, як будзе развівацца сельская бібліятэка...

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— Чытач ідзе да начытанага, спрактыкаванага бібліятэкара, які ведае не толькі фонд, але і гісторыю, выбітных людзей краю. А калі ён учора ў іншай сферы працаваў, а сёння — ля кніг, ды яшчэ без перападрыхтоўкі, дык чытачоў у яго ніколі не дадасца. На Ушаччыне ў бібліятэцы імя Васіля Быкава пра народнага пісьменніка мы так нічога цікавага і не пачулі, а вось у Глушы на Бабруйшчыне бібліятэкарка не адпусціла нас, пакуль не выклала погляд на постаць Алеся Адамовіча…

Яўген РАГІН:

— Мяркую, справа нават не ў спецыяльнай адукацыі. Галоўнае, каб чалавек слова любіў, мову. Для мяне ідэальны бібліятэкар — што хатні лекар, які ведае "хваробы" кожнага свайго чытача і кожнаму прапаноўвае "лекі". Такіх, як паказвае журналісцкая практыка", — мала. А без "навігатара" непадрыхтаваны чытач проста патанае ў кніжным моры. Вось і атрымліваецца, што актыўным чытачом на сяле называюць таго, хто прыходзіць у бібліятэку раз на месяц.

Марына ПШЫБЫТКА:

— Такіх асоб не стае і ў іншых сферах дзейнасці…

Алесь СУША:

— Няпрофільныя спецыялісты ёсць. Але далёка не заўжды такія спецыялісты — горшыя за выпускнікоў БДУКіМ ці спецыялізаваных каледжаў. Але ж і іншая сітуацыя бы-

"Жывы" чытач?

вае: прыязджае новы старшыня СВК і сваю жонку не ў паляводства працаваць накіроўвае, а ў бібліятэку... Існуе праблема і з перападрыхтоўкай ды павышэннем кваліфікацыі бібліятэкараў. У дачыненні да гэтага самы раз казаць пра рэфармаванне бібліятэчнай адукацыі…

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Частка нашых бібліятэкараў таксама не мае спецыяльнай адукацыі. Мы іх перападрыхтоўваем, і робім гэта, як падаецца, якасна. Але дзяржава павінна паклапаціцца аб павышэнні заробкаў адукаваных спецыялістаў. У іх вочы гараць! Але ж кожны жадае, каб яго высілкі былі належным чынам ацэнены. А гэтага няма. І праз два гады адпрацоўкі крэатыўшчыкі знікаюць…

Яўген РАГІН:

— А мо мы самі сапсавалі бібліятэкараў непатрабавальнасцю? Як кажуць выкладчыкі, самая пасіўная аўдыторыя пры павышэнні кваліфікацыі — бібліятэчная.

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— Вось да нас прыехалі чатыры маладыя спецыялісты. Заробак з прэміяй і надбаўкай — крыху больш за два мільёны рублёў. Трыста тысяч аддаюць за інтэрнат... Мы адкрылі бібліятэчнае аддзяленне на базе вугтэтая грамада паспрыяла таму, каб у сельскай установе з'явілася сучасная тэхніка. Дзеці для гэтага металалом здавалі...

Яўген РАГІН:

— Вось такі досвед і для іншых каштоўны... Але я лічу, што асноўны сельскі чытач на сёння — пенсіянер. Паўтаруся, маладыя вясковыя чытачы ў гарадскія бібліятэкі ходзяць...

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— А як справы з аптымізацыяй?

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— На Гродзеншчыне летась закрылі 58 бібліятэк. Сёлета — 15. Аб'яднаны 28 — на базе аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, 7 — на базе школ... Я супраць таго, каб школы ўтрымлівалі агульныя фонды. Там і камплектавання належнага няма. Перыядычныя выданні выпісаць няма ліятэкараў Беларусі дырэктар НББ Раман Матульскі агучыў факты, якія пераконваюць: па шэрагу сусветных паказчыкаў мы хранічна адстаём у развіцці бібліятэчнай справы. А мы з вамі працягваем называць праблемы, але не вельмі выразна ўяўляем, як яны будуць вырашаны.

Марына ПШЫБЫТКА:

— Як не ведаем?! Не завершана камп'ютарызацыя, дык яе трэба завяршаць! Частку маладых чытачоў мы і губляем, відаць, з-за таго, што сельскія бібліятэкі пакуль не могуць пахваліцца багаццем электронных носьбітаў... НББ праводзіла даследаванне: якія функцыі бібліятэк найбольш запатрабаваны. У горадзе 15% чытачоў хацелі б у бібліятэчных сценах ладзіць сустрэчы, рабіць творчую справу. На сяле колькасць такіх чытачоў дасягае 40%.

> На Форуме бібліятэкараў Беларусі дырэктар НББ агучыў: па шэрагу сусветных паказчыкаў мы хранічна адстаём у развіцці бібліятэчнай справы. А мы працягваем называць праблемы, але не ўяўляем, як яны вырашацца.

Паліна Бубіна.

Марына Пшыбытка.

Алесь Суша.

чылішча мастацтваў, дзе спецыяльную адукацыю можна атрымаць завочна. І літаральна прымушаем учарашніх аграномаў вучыцца. Для сельскіх бібліятэкараў ёсць курсы пры аблвыканкаме... Але я пагаджаюся, усё залежыць ад асобы.

Яўген РАГІН:

— Пры адсутнасці той асобы актыўнічаць не выпадае. Сельскія спецыялісты, у параўнанні з, да прыкладу, метадыстамі ЦБС, зарабляюць, наколькі ведаю, крыху больш. Але і там актыўнасць — рэдкасць. Занадта сціплыя бібліятэкары, да піяру сваіх спраў нязвыклыя. Ці непрывучаныя?

Юрый МАКСІМЕНКА:

— Ды не, прывучаем. Абласная бібліятэка, як метадычны цэнтр, актыўна дапамагае сельскім у распрацоўцы доўгатэрміновых творчых праектаў. Адзін з іх — стварэнне базы даных "Зніклыя, але не забытыя", прысвечанай бібліятэкам і населеным пунктам, што перасталі існаваць пасля аварыі на ЧАЭС…

Яўген РАГІН:

— Дапамажыце мне, калі ласка, высветліць, хто ж ён — асноўны чытач сельскай бібліятэкі.

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— Школьнік, напэўна.

Яўген РАГІН:

— Ды ён жа пад прымусам навучальнай праграмы ледзь не штодня ў бібліятэку бегае.

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— Не пагаджуся! У нас шмат прыкладаў, хоць бы і на Лідчыне, дзе бібліятэкары згуртавалі вакол сябе школьную чытацкую грамаду. І менавіта за што. Спадзяюся, вынікі эксперыменту будуць аб'ектыўна ацэнены і інтэграваныя ўстановы вернуцца на баланс нашага аддзела.

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Інтэграцыя публічных сельскіх бібліятэк са школьнымі адбылася ў нас летась. Фонды пры гэтым не пагоршыліся. Універсальны фонд школьнай установы зліўся з фондам публічнай. А падручнікамі займаецца школьны спецыяліст. Эканамічныя выгоды — несумненныя...

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— З якой перыядычнасцю працуюць бібліобусы?

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— Выезды — раз у месяц.

Яўген РАГІН:

— А як зразумець тое, што ў Харашках на Дзятлаўшчыне, дзе мы нядаўна былі, жыхары скардзяцца: бібліобуса год не бачылі?..

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— Справа ў тым, што старая машына "Газель" зламалася, і цяпер вырашаецца пытанне яе замены.

Юрый МАКСІМЕНКА:

— Інфармацыйная роўнасць паміж горадам і сялом будзе дасягнута, падаецца, не толькі выкарыстаннем нестацыянарных форм абслугоўвання. Трэба, каб развівалася віртуальная чытальная зала Нацыяналкі. А доступ да гэтых рэсурсаў маюць абласныя і пэўныя раённыя ўстановы.

Яўген РАГІН:

— Падаецца, пакуль віртуальная зала стане сапраўды ўсеагульнай, палова сельскіх бібліятэк спыніць існаванне... На майскім Форуме бібГаворка — пра стасункі і з чытачамі, і з бібліятэкарам. Таму да скарачэння бібліятэк на сяле варта падыходзіць асцярожна. Але ж і канкрэтныя праекты ў гэтым кірунку — заўжды ўхвальныя ды чаканыя. У адваротным выпадку, людзі застануцца ў вакууме. Я была ў такіх вёсках, дзе сацыяльнага работніка замяняе тэлевізар: уражанне не вельмі станоўчае…

Яўген РАГІН:

— Мы згодны: часам бібліятэка — гэта адзіны вясковы брэнд, які аб'ядноўвае грамаду і дае шанц паселішчу на выжыванне.

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— А як вызначыць эфектыўнасць бібліятэкі, каб яе не закрылі?

Марына ПШЫБЫТКА:

— Гэта яшчэ адна праблема. Дзяржаўны ўлік бібліятэчнай дзейнасці засноўваецца на паказчыках 2000 года, што адлюстраваны ў нацыянальным стандарце. На сёння некалькі асноўных паказчыкаў: колькасць чытачоў, кнігавыдача. Ад гэтага і залежыць, ці застануцца бібліятэка ды бібліятэкар.

Яўген РАГІН:

— Але гэтыя паказчыкі ў такім выпадку — асноўны стымул для бібліятэчных прыпісак, каб застацца?

Марына ПШЫБЫТКА:

— Аб прыпісках нічога не скажу... Мы кажам пра пераход абслугоўвання ў электронным асяроддзі. Аднак у дзяржаўнай статыстыцы на сёння ўлічваецца толькі выдача друкаванага дакумента. Нават у НББ, хоць віртуальных наведвальнікаў у нас ужо больш, чым "жывых"...

(Заканчэнне на стар. 6.)

На маю думку...

Тэатр.by: быць ці не быць?

Алег ЧЭЧАНЕЎ,
акцёр, рэжысёр

Узімку вядомы расійскі тэатральны крытык, тэатральны менеджар, перакладчык Павел Руднеў, які займае ў дадзены час пасаду памочніка мастацкага кіраўніка па спецпраектах МХАТа імя Чэхава, прадставіў у сваім блогу інтэрнэт-праект пад назвай "Спадчына Мастацкага тэатра. Электронная бібліятэка". Гэты праект увайшоў у комплекс акцый, прысвечаных святкаванню 150-годдзя з дня нараджэння К.С. Станіслаўскага. Карыстальнік Сеціва можа зайсці на сайт тэатра, націснуць на кнопку "Бібліятэка МХАТ" і азнаёміцца, напрыклад, з 9-м томам Збору твораў заснавальніка тэатра, дзе сабраны лісты з 1918 па 1938 гады. Тут жа прадстаўлены малатыражныя выданні, падрыхтаваныя навукова-даследчым цэнтрам Школы-студыі МХАТ. У відэагалерэі выкладзены запісы спектакляў тэатра. Там можна ўбачыць Ірыну Мірашнічэнка ў ролі Аркадзінай у "Чайцы", што паставіў Алег Яфрэмаў. Ці "№ 13" — п'есу, што набіла аскому, бо за яе ў свой час павальна ўхапіліся айчынныя тэатры. Тут жа — шматлікія тэлепраграмы Анатоля Смялянскага, які працяглы час узначальваў літаратурную частку, спасылкі на інтэрв'ю першых асоб тэатра ды шмат чаго іншага.

Славуты маскоўскі тэатр прыемна здзіўляе размахам, вектарам і сваёй скіраванасцю. І гэта нягледзячы на тое, што многія з матэрыялаў праекта, па сцвярджэнні Паўла Руднева, знаходзяцца на стадыі праверкі і тэхнічнай дапрацоўкі. Дарэчы, электронныя версіі кніг з медыятэкі МХАТа павінны з'явіцца ў фондах Бібліятэкі Кангрэса ЗША, у расійскіх і міжнародных бібліятэчных сістэмах.

Падумалася: а чаму б не аб'яднаць намаганні ўсіх зацікаўленых асоб, спецыялістаў і стварыць падобны інтэрнэт-праект, прысвечаны гісторыі беларускага тэатра, пачынаючы ад яго першых крокаў, станаўлення і заканчваючы нашымі днямі? Па ўсіх напрамках: драматычны тэатр, лялечны, дзіцячы, оперны, балетны, музычны. Гэты праект можа сумяшчаць функцыі як бібліятэкі, так і энцыклапедыі. Тут можна размясціць шматлікія даследаванні, артыкулы нашых тэатразнаўцаў, прысвечаныя знакавым персонам, з'явам і

> Падумалася: а чаму б не аб'яднаць намаганні ўсіх зацікаўленых асоб, спецыялістаў і стварыць падобны інтэрнэт-праект, прысвечаны гісторыі беларускага тэатра, пачынаючы ад яго першых крокаў, станаўлення і заканчваючы нашымі днямі?

падзеям беларускага тэатра. Не бачу нічога дрэннага ў тым, каб кнігі, выдадзеныя аднойчы абмежаванымі тыражамі, атрымалі электронны варыянт і знаходзіліся б у вольным доступе, каб каштоўнай інфармацыяй, якая ў іх закладзена, скарысталіся б журналісты, тэатразнаўцы, гісторыкі — ды хто заўгодна. І — у любой кропцы зямнога шара.

Нядрэнна было б прыцягнуць да праекта не толькі сталічныя, абласныя, але і рэгіянальныя тэатры. На сваіх персанальных старонках яны змаглі б самастойна выкласці гісторыю калектываў, указаўшы на важныя факты, звязаныя са станаўленнем той або іншай трупы.

Яшчэ. Возьмем, напрыклад, тэатральныя фестывалі. Ад узніклага на нашых вачах "Лялькі над Нёманам" да зніклых з фестывальных карт ці адкладзеных на нявызначаны час. Гэта Фестываль маладых тэатральных талентаў у Гродне, Рэспубліканскі фестываль "Маладзечанская Сакавіца", Міжнародны фестываль монаспектакляў "Я". Як бы хто да іх ні ставіўся, няўжо гэта не факт гісторыі?

Аднойчы ў сацыяльнай сетцы я знайшоў групу пад назвай "Блог пра беларускі тэатр". Энтузіясты сабралі і выклалі 62 запісы спектакляў. Яны розныя па ўзроўні, па змесце і па харэаграфіі: Мінск, Магілёў, Віцебск... У калекцыі ёсць і "Паўлінка" 1952 года. Гэта цудоўная, на мой погляд, ідэя, што патрабуе асэнсавання і больш абгрунтаванага падыходу прымяняльна да інтэрнэт-праекта.

У загаловак артыкула мною спецыяльна вынесена шэкспіраўская цытата. Вельмі цікава даведацца, у які бок перацягнуць шалі вагаў. Запрашаю ўсіх на абмеркаванне ідэі! Зрабіць гэта можна на старонках сацыяльных сетак штотыднёвіка: facebook.com/kimpressby і vk.com/kimpressby.

Аналагічную прапанову для рэгіянальных устаноў культуры агучыў дырэктар СДК з Асіповіччыны Мікалай Забаўскі на стар. 13.

"Круглы стол" "К": праблемы бібліятэчнай справы

А хто ты і дзе, "жывы" чытач?

Дзяржаўны ўлік бібліятэчнай дзейнасці засноўваецца на паказчыках 2000 года, што адлюстраваны ў нацыянальным стандарце. На сёння некалькі асноўных паказчыкаў: колькасць чытачоў, кнігавыдача. Ад гэтага і залежыць, ці застануцца бібліятэка ды бібліятэкар.

Пра ўстановы, якія не сталі "вёсказахавальнымі" брэндамі

(Заканчэнне. Пачатак на стар 1, 4 — 5.)

Алесь СУША:

— Трэба спадзявацца, што сітуацыя будзе выпраўлена...

Марына ПШЫБЫТКА:

— А яшчэ адна праблема — недахоп бібліобусаў.

Юрый МАКСІМЕНКА:

— Слушна! Але аўтабібліятэкі павінны мець і начынку, у тым ліку камп'ютарную.... Не дае спакою выказванне пра тое, што сельскія бібліятэкі — з аднолькавым абліччам. Не! Цягам двух гадоў на Гомельшчыне ладзіцца конкурс "Бібліятэка, неабходная грамадству". Раз на тры гады праходзіць ён і сярод сельскіх бібліятэк. Пераможцы ўдзельнічаюць у рэспубліканскім конкурсе "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры". І калі з пяці ўстаноў тры перамагаюць, гэта красамоўна…

Яўген РАГІН:

— Хто ж аспрэчвае? Але чаму з іншых абласцей у вас ніхто не вучыцца? "К" пераканана: кожная ўстанова культуры павінна мець сваё аблічча. Краязнаўчы кірунак, напрыклад. Але ж на справе і такое бывае. Пытаемся ў бібліятэкара: а чаму так вёска ваша называецца? А якія гістарычныя цікавосткі ў вас ёсць? І паказваюць нам агульны сшытак, дзе — пара здымкаў ды некалькі старонак рукапіснага тэксту. Так і з'язджаем, не даведаўшыся, адкуль у вёскі такая назва...

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Мы не агульныя сшыткі — мы кніжкі выпускаем пра кожны населены пункт! Усе бібліятэкі задзейнічаны. ЦРБ справу каардынуе...

Юрый МАКСІМЕНКА:

— У нас сельскія бібліятэкары ведаюць часам больш за супрацоўнікаў краязнаўчага аддзела абласной установы.

Паліна БУБІНА:

— Карані праблемы, звязанай з "агульнымі сшыткамі", я бачу ў не заўжды прафесійным стаўленні да справы і ў тэхнічным абсталяванні сельскіх устаноў. Нават у нашай абласной бібліятэцы хранічна не хапае гэтага абсталявання. Тым не менш, справу рухаюць энтузіясты.... Краязнаўства — справа сур'ёзная, шматгранная... І ў Мінскай вобласці энтузіястаў-бібліятэкараў шмат.

Яўген РАГІН:

— Валянціна Віктараўна пераканала нас ужо, што да краязнаўства бібліятэкары Дзяржыншчыны ставяцца з выключнай сур'ёзнасцю. А якія яшчэ прыклады назавяце?

Паліна БУБІНА:

— Раённая бібліятэка ў Барысаве, якая фантануе праектамі і дапамагае іх рэалізоўваць на сяле. Мясцовы краязнаўчы цэнтр лічу ўзорным, бо даследчая праца там набывае ўсё большыя маштабы... А цудоўны бібліятэкар Святлана Адамовіч са Стаўбцоўшчыны стала лаўрэатам згаданага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры". І менавіта сельскія бібліятэкары гэтага раёна дапамаглі мне ў складанні даведкі для базы даных Нацыянальнай бібліятэкі...

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— Паколькі гаворка вядзецца пра сацыяльную арыентаванасць устаноў, мы вырашылі, што любая бібліятэка Гродзеншчыны павінна ўтрымліваць інфармацыю аб прыёмным часе кіраўніцтва раёна і вобласці, аб тым, дзе можна вылечыць дзіця, можна пазнаёміцца з усімі рашэннямі выканкамаў. Нават калі жыхар не ведае, куды і як здаць лішнюю бульбу, сабраную з уласнага гарода, бібліятэкар павінен дапамагчы...

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— У нас гэта называецца "цэнтр сацыяльна-бытавой інфармацыі".

Яўген РАГІН:

— Шэраг бібліятэк на Гомельшчыне мае літаратуру, што падказвае жыхарам, як у зоне радыяцыйнага забруджання, дзе засталіся людзі, весці гаспадаранне, як страву гатаваць, як апрацоўваць садавіну ды гародніну... Бібліятэкары адчуваюць сацыяльную адказнасць за лёс чытачоў. І гэта павышае статус устаноў.

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— У мяне пытанне да калегі з Дзяржынска: а што вы зрабілі з дублетнай літаратурай пры аб'яднанні школьных і публічных бібліятэк?

Алесь СУША:

— Гэта не зусім так. Мы перыядычна праводзім сустрэчы з удзелам прадстаўнікоў усіх абласцей, нават у віртуальным рэжыме. Не так даўно ў нас прайшоў інтэрактыўны "круглы стол".

Яўген РАГІН:

— Лідзія Васільеўна, а як часта вас збіраюць на семінары, нарады?

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— Часта. Акрамя таго, мы рэгулярна кансультуемся са спецыялістамі з Нацыянальнай бібліятэкі.

Марына ПШЫБЫТКА:

— Кангрэсы, прэзентацыі, "круглыя сталы"… Нагод для сустрэч у бібліятэкараў шмат.

Яўген РАГІН:

— А я пра сваё. Дык ці патрэбна бібліятэчнай справе карэнная рэформа?

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Аптымізацыя ЦБС павінна быць. Адзін з яе шляхоў — інтэграцыя бібліятэк. Але ў кожным выпадку трэба ўлічваць мясцовыя фактары.

Яўген РАГІН:

— Пытанне іншага кшталту: як бібліятэкару павялічыць зарплату?

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Найперш — за кошт платных паслуг.

Яўген РАГІН:

— Не хочацца, каб бібліятэкі арыентаваліся толькі на план па аказанні платных паслуг. Асабліва недарэчным ён выглядае для дзіцячых бібліятэк. Разам з тым, магчымасці праявіць сябе крэатыўна, ды яшчэ за гэта грошы атрымаць — справа перспектыўная. Калі побач з бібліятэкай — старадаўні маёнтак, хто, як не бібліятэкар, павядзе турыстаў і раскажа пра мясцовыя славутасці?..

Алесь СУША:

— Колькі б мы ні стараліся, бібліятэка не стане ўстановай, на якой можна зарабляць вялікія грошы.

Яўген РАГІН:

— Гэта зразумела, але і губляць грошы, якія ляжаць літаральна пад нагамі, не хочацца. Колькі разоў даводзілася сутыкацца з сітуацыяй, калі сельскі бібліятэкар замест таго, каб правесці экскурсію, скіроўваў нас да мясцовага настаўніка гісторыі. Перакананы, пры належнай рэкламе, за якую мы змагаемся, турыст прыедзе ў глыбінку ды завітае ў бібліятэку, дзе і пакіне грошы.

Алесь СУША:

— Экскурсійная дзейнасць патрабуе ліцэнзавання, а гэта — фінансавыя ўкладанні. Ды і той жа школьны настаўнік, які мае больш вольнага часу, выглядае ў вачах патэнцыйнага турыста больш прывабна. Бібліятэкар, у сваю чаргу, можа падтрымаць, дапамагчы з літаратурай.

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— А я згодная з тым, што бібліятэчны работнік павінен добра ведаць свой край і праводзіць экскурсіі. Трэба пастарацца, каб турыст пакінуў у бібліятэцы грошы. Мы маем прыклад: па нашым філіяле — Доме Элізы Ажэшка — праводзяцца экскурсіі на беларускай, рускай, польскай і англійскай мовах. І гэта нягледзячы на тое, што там размяшчаецца бібліятэчны аддзел, фонды.

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— Наколькі тыя экскурсіі легальныя?

Алесь СУША:

— У тым і справа, што для правядзення экскурсіі на тэрыторыі ўласнага будынка ліцэнзія не патрабуецца.

Яўген РАГІН:

— Якім чынам заахвочваецца праца бібліятэкара?

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— 20% з зароблены сродкаў ідзе на заахвочванне і падтрымку бібліятэкараў. Астатнія грошы выкарыстоўваюцца на развіццё ўстановы. Дарэчы, пасля рамонту галоўнага корпуса будзем праводзіць экскурсіі па Новым замку ў Гродне, дзе знаходзіцца бібліятэка. Вось вы кажаце, што недарэчна браць грошы з дзяцей. Мы ж зладзілі праект — Дзень імянінніка. Паслуга каштуе 400 тысяч. І народ у чаргу выстройваўся!

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— Пытанне па выніках нашага апошняга аўтатура: ці пашырана сярод бібліятэк краіны практыка штотыднёвых санітарных дзён?

Валянціна КЛІМОВІЧ:

— Традыцыйна санітарны дзень бывае ў вызначаны час з перыядычнасцю раз на месяц. Таксама дзе-нідзе ёсць практыка раз на тыдзень рабіць санітарны дзень для ўборкі прылеглай тэрыторыі.

Марына ПШЫБЫТКА:

— Мясцовая ўлада можа зацвердзіць сандзень і раз на тыдзень, але гэта абавязкова павінна быць пазначана ў раскладзе ўстановы.

Яўген РАГІН:

— Быў у нас цягам апошняй камандзіроўкі прыклад, калі бібліятэка не пазначыла ў раскладзе сандзень. Наведвальнікі абураліся зачыненымі дзвярамі. Ізноў кадры…

Нельга таксама не закрануць пытанне роднай мовы. Суайчыннікі з-за мяжы з жалем адзначаюць, што беларускае слова на Радзіме сёння гучыць усё менш. Неразгорнутымі ў бібліятэках ляжаць кнігі сучасных аўтараў… А паўсюдныя моўныя памылкі, узведзеныя ў ранг нормы...

Алесь СУША:

— Бібліятэка з'яўляецца адлюстраваннем той сітуацыі, якая існуе ў грамадстве. Калі ў нашай краіне выдаецца менш за дзесяць працэнтаў літаратуры на беларускай мове і пры гэтым шмат кніг у фондах бібліятэк з расійскіх выдавецтваў, то спадзявацца на пераважную колькасць беларускамоўных выданняў не выпадае. Але, разам з тым, існуе і сістэма выпуску сацыяльна значнай літаратуры, у стварэнні якой бібліятэкі прымаюць непасрэдны ўдзел.

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— А для таго, каб павялічыць заробкі, трэба рэфармаваць заканадаўчую базу. Дайшло да таго, што з-за скарачэння колькасці бібліятэк знізілася да мінімуму група аплаты працы. У выніку бібліятэкары пры тым жа аб'ёме працы атрымліваюць менш. Цягам дзесяці гадоў Міністэрства культуры абяцае ліквідаваць гэтую недарэчнасць… Тое ж самае датычыцца і стандарту, дзе павінны ўлічвацца тыя ж віртуальныя чытачы. Адменены палажэнні аб бібліятэцы-клубе, аб краязнаўчай дзейнасці. Новых жа няма, як няма новай рэдакцыі ды інструкцыі па ўліку і захаванасці бібліятэчнага фонду.

Кастусь АНТАНОВІЧ:

— А хто павінен тым займацца?

Лідзія МАЛЬЦАВА:

— Мяркую, што Міністэрства культуры. Мы ж гатовы дапамагчы, выказаць свае прапановы…

Ад рэдакцыі

Мы ў чарговы раз закранулі болевыя кропкі нашай бібліятэчнай справы. Гэтая тэма — адна з вядучых для рэдакцыйнага аддзела рэгіянальнай культуры. І людзей на "круглы стол" запрасілі дасведчаных, цікавых. Таму гутарка аказалася ўзаемакарыснай. Але "К" вельмі хацела б, каб у абмеркаванні праблем ды перспектыў прыняў не дзясятак чалавек, а літаральна ўся зацікаўленая бібліятэчная грамада... Не прыхоўваем, вельмі баімся чытацкага маўчання пасля вось гэтай чарговай публікацыі пра Слова, кнігу, вёску...

Таму запрашаем усіх неабыякавых да працягу гаворкі з дапамогай электроннай пошты, сацыяльных сетак, а можна звязацца з Яўгенам Рагіным і Кастусём Антановічам па любым з рэдакцыйных тэлефонаў. Змест ліста ці тэлефанавання прыблізна такі: асноўная праблема ўстановы і ваша бачанне вырашэння гэтай праблемы. Усе заўвагі будуць без прамаруджвання апублікаваны. Адначасова "К" займее магчымасць высветліць, наколькі балючай з'яўляецца для вас тэма нашага "круглага стала", наколькі хвалюе вас далейшы лёс сельскіх бібліятэк. Чакаем!..

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com!

Эстафета сусветнай мастацкай сталіцы пераходзіць з горада ў горад па меры правядзення там буйных імпрэз, куды сцякаецца "ўвесь бамонд". Пачынаючы з 20 верасня гэты пачэсны тытул на месяц займее Масква, дзе пройдзе ўжо пятае па ліку Біенале сучаснага мастацтва. Да выправы туды рыхтуюцца сотні куратараў ды мастакоў з усяго свету — уключна і з Беларуссю. Ужо ў другі раз запар наша краіна будзе прадстаўлена ў біенальнай праграме спецыяльным праектам. 24 верасня ў дзвюх залах Музея сучаснай гісторыі Расіі адкрыецца выстаўка Канстанціна Селіханава і Андрэя Шчукіна "Дэкадзіроўка. Архетып адэкватнага часу", арганізаваная Музеем сучаснага выяўленчага мастацтва пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Наталля Шаранговіч.

Міхаіл Баразна.

Нездаровы ажыятаж і нашы "траблы", пра якія ведаць не хочуць

Што не прымае сучасны арт?

Разам і паасобку

Гэты "мультыдысцыплінарны" аўтар мае некалькі іпастасяў. З аднаго боку, ён — скульптар з акадэмічнай адукацыяй, які ўмее "ляпіць рукамі", з іншага — мастак-канцэптуаліст, што не абмяжоўваецца тэхнічна дасканалым візуальным рашэннем. З аднаго боку — паспяховы і запатрабаваны творца (акурат сёння бачыў "білборд" з яго выявай у якасці "чалавека года" па версіі Мінгарвыканкама), з іншага — адстаронены і самадастатковы мысляр са здаровай схільнасцю да крытычнага дыскурсу. Мяркуючы па творчасці аўтара, у дадзеным выпадку парадоксы — спрыяюць.

— У сваіх творах Косця ўвесь час вынаходліва абыгрывае паняцці прасторы і часу, — кажа Наталля Шаранговіч. — Яго скульптура прыцягальная тым, што крохкасць ідэй набывае манументальную форму. Канстанцін — творца, які валодае ўнікальным пластычным мысленнем, здатным арганічна ўвасобіць любую ідэю. У тым ліку і той "скразны" для яго вобраз маленькага чалавечка, які паходзіць з побытавай культуры нядаўняга мінулага…

— У свой час мяне прывабіў вобраз удзельніка парада фізкультурнікаў 20-х гадоў: гэткія абязлічаныя "адзінкі" ў аднолькавых майках ды портках, — распавядае сам аўтар. — І тыя залатыя майкі — нібы нішчымная прыватная тэрыторыя, ілюзорная "свая прастора"...

Што ні кажы, але савецкая тэматыка (успрынятая зазвычай у кафкіянскім духу) ужо даўно прываблівала мастакоў — ажно з пачатку 1970-х, калі нарадзіўся сацарт. Здавалася б, тэма вычарпана і нават набіла аскому. Але ўспрыняцце праекта Канстанціна Селіханава ў якасці нейкай "рэтраспектыўнай" крытыкі "абязлічвання" чалавека ў мінулую эпоху будзе павярхоўным.

— Чарга — гэта ўніверсальная метафара, што спалучае як сацыяльны, так і экзістэнцыйны ўзроўні, — кажа аўтар, — метафара суіснавання чалавека з чалавекам. Асэнсоўваючы перажыты намі савецкі побыт, я неўзабаве прыйшоў да высновы, што многія яго вобразы маюць універсальны характар. Вось і сёння, у эпоху глабалізацыі, мы нібы разам, але — паасобку…

Калі ўдзельнік парада фізкультурнікаў выйдзе на вуліцу сучаснага мегаполіса, ён і сам здзівіцца з той прычыны, што шматлікія вонкавыя змены так мала паўплывалі на сутнасць чалавечых узаемаадносін.

Бронзавая чарга Селіханава неаднаразова дэманстравалася ў айчынных залах — у тых або іншых варыяцыях. У Маскве "працяг тэмы" будзе ўвасоблены інакш: у выглядзе цэласнай інсталяцыі.

— Чарга маленькіх чалавечкаў з абодвух бакоў упіраецца ў люстэркі, — распавядае Наталля Шаранговіч. — Гэта нібыта парталы, выйсце з замкнёнай прасторы, але выйсці з іх немагчыма, і справа абмяжоўваецца тыражаваннем рэчаіснасці. Тут згадваецца стужка Мёбіўса...

Канстанцін Селіханаў.



Андрэй Шчукін.

Работы Канстанціна Селіханава і Андрэя Шчукіна, што прадставяць Беларусь на Маскоўскім біенале, глядзіце на стар. 9 у рубрыцы "Art-блог".

Партрэты прадметаў

Для таго, каб падтрымаць той варыянт "расшыфроўкі" паняццяў прасторы і часу, якую прапануе Канстанцін Селіханаў, куратар вырашыў запрасіць да ўдзелу яшчэ аднаго мастака. Тым больш, гэтага патрабавалі і сёлетнія ўмовы біенале.

— Праект Косці — самадастатковы, і важна, каб другі ўдзельнік яму не супярэчыў, — тлумачыць Наталля Шаранговіч. — Уласна, менавіта таму мы і запрасілі фатографа. Чаму? Бо жывапіс, як і скульптура, сам здатны ствараць уласную рэчаіснасць, а вось фота ўжо апрыёры з'яўляецца "адбіткам", прымушаючы час спыніцца...

У выніку выбар спыніўся на Андрэі Шчукіне. Гэты аўтар таксама існуе ў некалькіх іпастасях, у тым ліку — і паспяховага камерцыйнага фатографа, сапраўднага перфекцыяніста ў галіне гламуру. Але лішне нават казаць, што ў Маскву паедуць зусім іншыя яго творы. Іх жанр можна акрэсліць як "партрэт прадмета" — не нацюрморт, а менавіта партрэт. Гаспадары прадметаў знарок засталіся па-за кадрам, і таму антрапагенны змест выявы адчуваецца толькі на асацыятыўна-кантэкстуальным узроўні.

— Мы хочам паказаць Андрэя Шчукіна, які шукае архетыпічныя сутнасці неадушаўлёных рэчаў, — распавядае Наталля Шаранговіч. — Ніякіх твараў, ніякіх асоб — толькі рэчы! Але яны міжволі выклікаюць пэўныя асацыяцыі і самі па сабе адлюстроўваюць сутнасць сваіх нябачных гаспадароў. Гэтыя фота выяўляюць чалавека без выявы чалавека, і такі падыход выглядае нават больш пераканаўчым. Чаму? Узіраючыся ў рэалістычны фотапартрэт, хіба можам мы зразумець, што хаваецца па-за выявай, зазірнуць углыб і "прачытаць" гэтую асобу? А вось прадметы — са сваёй фактурай, выбоінамі, сколамі — здатныя распавесці пра ўнутраны свет чалавека куды больш. Такі падыход — цікавы і незвычайны. Прадстаўленыя ў рамках праекта серыі сведчаць, што Андрэй адчувае рэчаіснасць куды глыбей, чым многім з нас раней здавалася...

У кантэксце браневічкоў

Праекты мінулага Маскоўскага біенале наведала звыш 70 тысяч гледачоў. Большасць з тых людзей не адносіцца да катэгорыі стабільных наведвальнікаў музеяў. Міхаіл Баразна спадзяецца, што запатрабаванасць сучаснага мастацтва — гэта ўсё ж не мода, але — ўнутраная патрэба глыбокага асэнсавання таго, што дзеецца ўнутры і звонку.

— Таму я перакананы: беларускі праект можа мець самую разнастайную аўдыторыю, — лічыць мастацтвазнаўца. — Ён мае што сказаць як людзям з філасофскай адукацыяй, так і маладзёнам "з вуліцы", сярод якіх, дарэчы, нараджаецца такое цікавае мастацтва, як стрыт-арт. Галоўнае — гэта ўнутраныя патрэбы гледача...

І, дадамо ад сябе, — каб глядач усё ж дабраўся да беларускага праекта. У маскоўскім "вулеі" гэта асабліва актуальна, тым больш — у час біенале, калі адначасова працуюць дзясяткі выставак, раскіданых па ўсім горадзе. Натуральна, для нас (як і для любога "цёмнага коніка") найаптымальным варыянтам было б прысуседзіцца да "топавых" выставак альбо займець свой кут у папулярных цэнтрах сучаснага мастацтва, куды публіка заўсёды валам валіць. Але паспрабуй туды ўбіцца!..

Беларускія "Унутраныя ландшафты", створаныя куратарамі Паўлам Вайніцкім і Вольгай Рыбчынскай, экспанаваліся ў класіцыстычным палацы, дзе некалі нават выступаў Ленін. Цяпер там — Усерасійскі музей ДПМ. Не зусім арганічны для "сучарта" кантэкст адпаведным чынам паўплываў на колькасць наведвальнікаў.

Гэтым разам папярэдні досвед быў улічаны, і "аблямоўка" ўжо куды лепш дапасоўваецца да праекта. Музей сучаснай гісторыі Расіі многія памятаюць па старой назве — Музей рэвалюцыі, — ды і браневічкі ўсё яшчэ стаяць перад уваходам…

— Праект Канстанціна Селіханава ў Мінску дэманстраваўся ў Мемарыяльным музеі Заіра Азгура, які сам па сабе з'яўляецца своеасаблівым "злепкам" савецкай эпохі, — кажа Наталля Шаранговіч. — Мы шукалі падобную пляцоўку і ў Маскве, ды, на жаль, не знайшлі. Аднак, кіруючыся да нашых залаў, глядач будзе паступова занурвацца ў кантэкст: яго шлях ідзе праз экспазіцыю, прысвечаную савецкай эпосе… Ды і дабірацца будзе прасцей: музей знаходзіцца на маскоўскай Цвярской.

■■■

— Важна адзначыць і тое, што ўдзел дзяржавы ў праекце прыкметна вырас, у параўнанні з мінулым разам, — дадала Наталля Шаранговіч. — І менавіта таму мы можам прадставіць беларускае мастацтва на куды больш паважнай пляцоўцы. Бо ініцыятывы канкрэтных асоб або інстытуцый усё ж замала для рэпрэзентацыі нашай краіны на высокім узроўні…

На думку куратара, падобныя праекты сапраўды здатныя адкарэктаваць міжнародны імідж дзяржавы, засведчыўшы яе далучанасць да сусветнай культурнай ды інтэлектуальнай прасторы. Прычым — зрабіць гэта нязмушана і без дэкларатыўнага пафасу, якія сучаснае мастацтва арганічна не прымае…

Ілья СВІРЫН
Фота Юрыя ІВАНОВА
і з архіваў суразмоўцаў

Тэатральная плошча

8 верасня Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа адкрыў сезон — гучна і ўрачыста. Першым моцным акордам стала прэм'ера спектакля "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" паводле твораў Уладзіміра Караткевіча ў пастаноўцы Міхася Краснабаева.

"Хрыстос прызямліўся...". У Віцебску

Пераемнасць пакаленняў — не "пінг-понг"

Да гэтай падзеі трупа рыхтавалася яшчэ ў мінулым сезоне. У апошні дзень перад сыходам у адпачынак, напрыканцы ліпеня, ужо цалкам завершаная пастаноўка была прэзентавана мастацкаму савету. Але ж адпачынак для творцаў — рэч даволі адносная. За жнівень зробленае і напрацаванае было яшчэ больш глыбока асэнсавана пастановачнай групай і ўдзельнікамі спектакля. І за тыя некалькі вераснёўскіх дзён, што папярэднічалі прэм'еры, пастаноўка была не проста дадаткова адрэпеціравана — у яе былі ўнесены некаторыя новыя штрыхі. Будзем спадзявацца, не апошнія, бо любы спектакль жыве і развіваецца (ці, наадварот, патроху памірае) з кожным чарговым паказам. Таму хацелася б напрарочыць прэм'еры папраўдзе шчаслівае жыццё — як на стацыянарнай сцэне, так і на фестывалях, пачынаючы з Фестывалю нацыянальнай драматургіі імя В.Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску, што адбудзецца напрыканцы года.

Удасканальваць у спектаклі сапраўды ёсць што. Найперш — акцёрскую ігру. Але залогам яго далейшага сцэнічнага жыцця з'яўляецца тое, што найбольш цікавымі ды адметнымі паўстаюць менавіта тыя складнікі, перарабіць ці нават паправіць якія бывае ўжо немагчыма. Відавочна, што і сам тэатр, і ўласна Міхась Краснабаеў звярнуліся да Караткевіча невыпадкова. У свой час на Коласаўскай сцэне ўвасабляліся "Званы Віцебска", "Ладдзя Роспачы", "Леаніды не вернуцца на зямлю". Дзве апошнія пастаноўкі — усё таго ж Краснабаева. Дый першай рэжысёрскай работай гэтага вядомага артыста стала "Вераб'іная ноч". Узгадаем і тое, што летась у лістападзе ў Віцебскай гарадской ратушы паказвалася "школьная" пастаноўка "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", ажыццёўленая Аленай Ганум і навучэнцамі тамтэйшай гімназіі № 2. Дарэчы, шмат у чым яна была ініцыявана дырэктарам — мастацкім кіраўніком Коласаўскага тэатра Валерыем Анісенкам, які ўвогуле вельмі клапоціцца пра нацыянальны рэпертуар (ва ўсіх яго вымярэннях) ды пра падрастаючае пакаленне не толькі дзеячаў тэатра, але і проста яго прыхільнікаў.

Як прызнаўся Міхась Краснабаеў, ён наўмысна не глядзеў тую версію, бо даўно ўжо абдумваў сваю. Інсцэніроўка паводле гэтага рамана — справа няпростая. Шмат ад чаго давялося адмовіцца (найперш — ад многіх старонак каларытнага, сакавітага гумару), бо рэжысёр абраў не адзін фрагмент, ракурс аповеду ці, да прыкладу, гісторыю аднаго героя, а максімальна зразумелае нават для тых, хто не чытаў арыгінала, выкладанне асноўнай канвы і галоўнае, пранізлівых, надзвычай актуальных думак пісьменніка-класіка. Азначэнне "паводле твораў" не павінна ўводзіць у зман: акрамя рамана, быў выкарыстаны яшчэ верш Караткевіча.

Спектакль можна па праве лічыць аўтарскім, бо Краснабаеў прыдумаў і вельмі ўдалую сцэнаграфію. Некалькі аднолькавых драўляных збудаванняў, падобных да своеасаблівых "крыжоў" ці супрацьтанкавых "вожыкаў", ператвараюцца і ў крэслы-лавы, і ў дзіўнаватую агароджу, і ў вогнішча. Не абышлося і без падвешанага звона, што таксама мае вялізную повязь асацыяцый.

Моцным бокам пастаноўкі стала музыка народнага артыста Беларусі, знакамітага кампазітара Сяргея Картэса. Яна быццам прадоўжыла маральна-філасофскую праблематыку такіх яго опер, як "Джардана Бруна", "Матухна Кураж", "Візіт дамы", а таксама пакуль незавершанай "Ладдзі Роспачы", дзе героі аказваліся перад выбарам, лёсавызначальным не толькі для іх саміх, але і для свайго атачэння: ад блізкіх і сяброў да цэлага горада ды ўсёй роднай зямлі. Шкада толькі, што тэмбрава адметныя, выразныя тэмы часам абрываюцца, мікшыруюцца, прычым не заўсёды ў адпаведнасці з музычнай логікай свайго развіцця. Такой фрагментарнасці можна было пазбегнуць, запрасіўшы аўтара да непасрэднага ўдзелу ў пастановачным працэсе, хаця б на апошнім яго этапе. Ёсць, праўда, і іншае выйсце: на аснове музычнага матэрыялу, прапанаванага тэатру і выкарыстанага ім далёка не цалкам, кампазітар мог бы напісаць адметны самастойны твор.

У спектаклі занята амаль уся трупа, што на сённяшнім этапе ўяўляецца вельмі важным для Коласаўскага тэатра. Пастаноўка яднае не толькі акцёрскі склад, патрабуючы ад яго філігранных "ансамблевых" якасцей (іх дасягненне — справа ўсяго жыцця кожнага артыста), але і сцэну з залай, запрашаючы публіку да нячутнага "дыялога душ". Вялікія надзеі пакідае Дзмітрый Каваленка, для якога роля Юрася Братчыка стала не проста першай буйной, а ўвогуле першай. Ён быў прыняты ў трупу з 1 ліпеня, як толькі скончыў Віцебскі каледж мастацтваў, і адразу ўключыўся ў працу над спектаклем, што на той час ужо ішла поўным ходам, а паралельна — паступаў (і паступіў!) у Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. Тое, што тэатр паверыў і ў яго, і ў іншых маладых артыстаў, якія ўпрыгожваюць спектакль сваёй энергетыкай, сведчыць аб тым, як сур'ёзна пачалі там ставіцца да заўсёды балючай праблемы змены і пераемнасці пакаленняў.

Сапраўднай кульмінацыяй становіцца фінальны дыялог Братчыка і бурмістра Юстына, якога ўвасабляе адзін з найстарэйшых коласаўцаў — народны артыст Беларусі Тадэвуш Кокштыс. Рэжысёр рызыкнуў развесці герояў па розныя бакі сцэны і пакінуць у "традыцыйна опернай" мізансцэне, калі яны практычна пазбаўлены рухаў. Але дыялог не ператвараецца ў "пінг-понг" на недасягальнай адлегласці — ён амаль візуальна нагадвае "згустак энергетыкі", што вось-вось сягне ў касмічныя далячыні… А тыя, між іншым, асацыіруюцца і з планамі тэатра на сезон — нават больш чым "касмічнымі"…

На здымках: сцэны са спектакля "Хрыстос прызямліўся ў Гародні".

Фота Марыны КАТЛЯРОВАЙ

Камертон

...І "Чамадан успамінаў"

Другі Музычны фестываль памяці сусветна вядомага кампазітара Мікалая Набокава, стрыечнага брата знакамітага пісьменніка, прайшоў на Гродзеншчыне. Асаблівасцю сёлетняга свята стала тое, што яно было прысвечана 110-годдзю з дня нараджэння музыканта.

Першы такі фестываль, які адкрыў для нас гэтае кампазітарскае імя, быў ініцыяваны Нацыянальнай камісіяй Беларусі па справах UNESCO і яе старшынёй Уладзімірам Шчасным, які ўвогуле шмат працягвае рабіць для беларускай культуры. Гэтым разам фестываль ахапіў не толькі Мірскі замак ды гарадскі пасёлак Любчу, дзе нарадзіўся будучы аўтар першага амерыканскага балета, але і Навагрудак. Музыка Набокава гучала на розных сцэнах — ад Партрэтнай залы музея да Дзіцячай школы мастацтваў і Дома культуры. Два гады таму канцэрты былі камерна-інструментальнымі, і некаторыя сімфанічныя творы гучалі ў пералажэнні для трыа салістаў "Вытокі". Цяпер да ўжо прызнаных папулярызатараў творчасці майстра — лаўрэатаў міжнародных конкурсаў Юрыя Блінова (фартэпіяна), які сёлета выступіў музычным кіраўніком фестывалю, і Аляксея Фралова (фагот) — далучыліся салістка Беларускай оперы Таццяна Гаўрылава (сапрана) і камерны аркестр Гродзенскай абласной філармоніі. Адпаведна, да дзвюх санат (для фартэпіяна і для фагота), фартэпіяннага пералажэння сюіты з балета "Дон Кіхот" ды іншых твораў дадаўся вакальны цыкл на вершы Ганны Ахматавай — у пералажэнні Юрыя Блінова для аркестра. Дарэчы, месца раптоўна захварэўшага фагатыста ў аркестры давялося заняць Аляксею Фралову — і чытаць партыю з ліста.

Сапраўдным упрыгожаннем фестывалю стаўся міні-спектакль "Чамадан успамінаў", створаны паводле аўтабіяграфічнай кнігі Мікалая Набокава, што выдае бліскучую літаратурную адоранасць музыканта.

На фестываль, як і мінулым разам, з'ехаліся сваякі кампазітара — прадстаўнікі розных пакаленняў. Быў сярод іх і ўнук Мікалая Набокава, які, як і дзядуля, абраў мастацкі шлях у сваім жыцці і займаецца дызайнам ды разьбой па дрэве.

На здымку: пад час спектакля "Чамадан успамінаў" у рамках Другога Музычнага фестывалю Мікалая Набокава.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея БУНЦЭВІЧ

Мастыхін: 14 верасня — Дзень горада ў сталіцы

М.Манасзон. "Нядзельнік па аднаўленні Мінска".

Чым ганарыцца Мінск?

Да Дня горада Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны падрыхтаваў мастацкую выстаўку "Мінск — ведаць, помніць, ганарыцца". Яна прысвечана падзеям амаль 70-гадовай даўніны: вызваленню Мінска ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Экспазіцыю складаюць творы мастакоў ваеннага пакалення, для якіх гэтая гістарычная дата яшчэ і факт уласнай біяграфіі. Некаторым з іх давялося занатаваць алоўкам ды пэндзлем жахі акупацыі, іншыя ўбачылі зруйнаваны горад пасля вызвалення… Зробленыя з натуры замалёўкі сталі асновай для будучых жывапісных палотнаў, у якіх увасобіліся гераізм ды мужнасць няскоранага горада.

Калі бачыш дакументальныя малюнкі і акварэлі М.Філіповіча, П.Масленікава, У.Сакалова ды іншых мастакоў — сведкаў той пары, міжволі параўноўваеш іх з сённяшнімі краявідамі Мінска. Праз гэтае параўнанне ўсведамляеш маштаб працоўнага подзвігу мінчан, якія адрадзілі свой горад і зрабілі яго адной з найпрыгажэйшых сталіц Еўропы.

Стрыжань — палотны "Партызанскі парад у Мінску" Я.Зайцава, "Нядзельнік па аднаўленні Мінска" М.Манасзона, "Свята Перамогі ў Мінску 9 мая 1945 года" Я.Ціхановіча і І.Давідовіча. Яны былі створаны ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе паводле канонаў сацыялістычнага рэалізму. Гэта значыць, што карціны дакладна вывераныя ідэалагічна, але пры гэтым у іх ёсць мастацкая шчырасць і гістарычная праўда. Менавіта так людзі радаваліся Перамозе, з такім энтузіязмам адбудоўвалі сталіцу…

Выстаўка — вандроўка ў мінулае. Для кагосьці яна — згадка пра гістарычныя падзеі, для некага — сустрэча з мастацкім напрамкам, які калісьці дамінаваў, а цяпер сам стаў гісторыяй. А нехта прыйдзе на сустрэчу з маладосцю…

Могуць стаць помнікамі…

Таксама напярэдадні Дня горада ў Мінскай ратушы адкрылася выстаўка работ вядомага скульптара Алеся Шатэрніка. Уся творчасць гэтага майстра звязана са сталіцай. Тут ён вучыўся, тут працуе. У Мінску, на праспекце Пераможцаў, устаноўлена самая вядомая з ягоных манументальна-дэкаратыўных скульптур — "Гуканне вясны". Сталіцы прысвяціў Шатэрнік і гэтую выстаўку.

А.Шатэрнік. "Якуб Колас — настаўнік".

Станковыя скульптуры, прадстаўленыя ў экспазіцыі, па сутнасці, з'яўляюцца праектамі помнікаў, і гэтая акалічнасць вызначае іх пластыку. "Кірыла Тураўскі", "Рагнеда", "Вітаўт", "Мікола Гусоўскі" створаны даволі даўно, але аўтар не губляе надзеі аднойчы пабачыць сваіх герояў на пастаментах на гарадскіх плошчах. Тая ж манументальная выразнасць, але ў спалучэнні з побытавай цеплынёй, прысутнічае ў ягонай кампазіцыі "Якуб Колас — настаўнік": Колас запальвае лямпу, каб асвятліць кнігу ў руках вучня. Немудрагелістая сімволіка з глыбокім сэнсам. Між іншым, таксама някепскі быў бы помнік…

Акрамя скульптурнай пластыкі ў экспазіцыі прадстаўлена яшчэ адна іпастась Шатэрніка — жывапісец. Кажуць, калі чалавек таленавіты, дык ён таленавіты ва ўсім. Карціны скульптара (а ён яшчэ і літаратурныя тэксты піша) пераконваюць, што гэта насамрэч так. Хіба што ў пластыцы Алесь Шатэрнік шануе брутальную форму ды скіраваны да асэнсавання падзей і з'яў нацыянальнага маштабу, а ў жывапісе паўстае лірыкам…

Матэрыялы падрыхтаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Праект

У гродзенскай галерэі "Крыга" адбыўся вернісаж аднаго са сталых удзельнікаў выставачнага праекта "Art-Zabor" Руслана Вашкевіча. Таксама ў рамках акцыі "Адзін вераснёвы дзень" жыхары горада выбралі свайго прадстаўніка на тамтэйшым этапе. Ім стане вядомы графік Юрый Якавенка.

Прэзентацыя

Прадстаўляем работы беларускіх удзельнікаў 5 Маскоўскага біенале сучаснага мастацтва. Гэта скульптурная кампазіцыя "Чарга" Канстанціна Селіханава, а таксама фота Андрэя Шчукіна.

Майстар

Кірунак дыялога

Ізноў пра Міхася Дрынеўскага. Вылучэнне яго на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва, — заканамернае. Хаця, здавалася б, для кагосьці і нечаканае: кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г.Цітовіча, які павінен дбаць пра нацыянальны рэпертуар, — і прэмія, што адзначае праявы сяброўства беларусаў з расіянамі. Але ж...

Суадносіны паміж беларускай і рускай культурамі ў сярэдзіне XX стагоддзя, калі Генадзь Цітовіч узначаліў аматарскі калектыў, зрабіўшы яго прафесійным, вызначаліся "матчынай перавагай" рускіх традыцый. Народныя калектывы ўсіх рэспублік былога Саюза ствараліся па ўзоры і падабенстве аналагічных рускіх. Падобную паралель можна прасачыць і тут. Як у 1911-м этнограф Мітрафан Пятніцкі з'яднаў 18 сялян з трох расійскіх губерняў, і тыя скарылі маскоўскую публіку фальклорнай аўтэнтыкай, так і Генадзь Цітовіч — адкрыў для грамадскасці палескіх бабуль, што ўразілі адметнасцю самой спеўнай манеры. Але ж менавіта ў гэтым — у розных фальклорных традыцыях — прынцыповае адрозненне калектываў. Сапраўды, на першым этапе свайго існавання наш Народны хор быў, калі можна так сказаць, выключна беларускім і па рэпертуары, і па манеры. Міхась Дрынеўскі прыйшоў у яго больш як сорак гадоў таму і ў хуткім часе ўзначаліў. Менавіта ён пачаў рухаць калектыў у бок дыялога культур — паўнапраўнага і на роўных. Гэты дыялог ахоплівае самыя розныя культуры, але найперш, вядома, — славянскія. І руска-расійскі складнік займае ў ім самае пачэснае месца. Бо толькі ў такім дыялогу, дзе кожны мае не толькі свой голас, але і права быць пачутым, магчымае сапраўднае разуменне як уласнай культуры, так і найбольш блізкіх нам асаблівасцей іншых.

Звярніце ўвагу на тое, як своеасабліва, з няўлоўнымі беларускімі рысамі, гучаць у хоры Дрынеўскага ўсім вядомыя рускія песні! Пунсова бесшабашныя фарбы раптам пакрываюцца шляхетным вэлюмам, а жудасна нясцерпны боль пранізвае светлы праменьчык, праз які нават змрочная туманнасць выглядае мяккай і пушыстай… Ёсць свае рысы і ў звароце хору да духоўных твораў. Гэты кірунак, супрацьлеглы тэатралізавана-"кірмашовым" забавам з моцным інструментальна-танцавальным складнікам, не адразу атрымаў паразуменне не толькі сярод прыхільнікаў народных спеваў, але і самога калектыву. Але гэтай лініяй Дрынеўскі шмат у чым звязаў нашу даўніну ды сучаснасць, аднавіў гістарычную справядлівасць, нагадаўшы пра рэлігійныя традыцыі Беларусі — і, галоўнае, пра яе мірнае, спагадлівае суіснаванне розных канфесій, што выхоўвалася цягам стагоддзяў, а калі і парушалася часам, дык умяшальніцтвам свецкіх улад. Усё гэта — здабытак не адно беларусаў, а, у такой жа меры, і расіян, для якіх не менш важкім ды важным аказваецца погляд на іхнюю культуру быццам бы звонку — і адначасова знутры, толькі пад іншым ракурсам.

Такая ж светлая прамяністасць, няўрымслівасць, неверагоднае спалучэнне шляхецкай спагадлівасці з сялянскай грунтоўнасцю ўласцівыя і самому Міхасю Паўлавічу. Ён вельмі пакутуе, што гастролей не так шмат, як хацелася б. Яму заўсёды мала — не выгод, а мастацкіх набыткаў, паездак, перамог. Цяжка ўявіць, як ён паспявае "праварочваць" такую колькасць грамадскіх і іншых нагрузак: нязменны старшыня Беларускага саюза музычных дзеячаў, член журы бясконцых конкурсаў-фестываляў-адбораў, у тым ліку ў замежжы. Далучыце сюды шматлікія кансультацыі, майстар-класы, нарэшце, пасяджэнні. Не чалавек — матор: дрынь-дрынь-дрынь — і завёўся! Але ж калі і так, дык "матор" не механічны, а — жывы, гуллівы, каларытны, адухоўлены. Дый прозвішча, як лічаць даследчыкі, мае зусім іншае паходжанне — рэлігійнае. Нарадзіўся на Гомельшчыне, што мяжуе з Расіяй. У гэтым фальклорна-этнаграфічным рэгіёне хапае песень, якія лічацца народнымі і ў беларусаў, і ў расіян. Агульная спадчына? Так, пэўна, і Міхась Дрынеўскі — з тых "шчырых беларусаў", каго гэтак жа шчыра прызнала Расія. І які сваёй "беларускасцю" не аддаляе нашу краіну ад суседніх, а працягвае ім руку сяброўства, мацуючы культурныя сувязі як залог міру ды саюзніцтва…

Надзея БУНЦЭВІЧ, музыказнаўца, член Беларускага саюза кампазітараў

Турпраект "К": па колішнім Віленскім краі

Калі "адвісалі сківіцы", а калі ў нас было лепш

Пад'язджаючы да Вільнюса з беларускага боку, ты абавязкова павінен перасекчы колішнія велізарныя ўладанні Тышкевічаў. Бы той казачны маркіз Дэ Карабас, гэты род валодаў тут ледзь не кожным хмызочкам. Чатыры шыкоўныя палацава-паркавыя ансамблі своеасаблівай дугой апяразваюць колішнюю вялікакняжацкую сталіцу.

Род Тышкевічаў на Беларусі памятаюць і ведаюць — прычым не столькі праз яго багацце, колькі праз схільнасць да мецэнацтва і навукі. Згадайма хаця б тое, што стараннямі ўлад Вілейшчыны ды простых энтузіястаў кожнае лета ладзіцца "трыб'ют" воднай экспедыцыі графа Канстанціна, які ў перспектыве можа стаць прывабным транспамежным маршрутам.

У той самы час, матэрыяльных сведчанняў магутнасці гэтай фаміліі на тэрыторыі Беларусі засталося няшмат: палац у Валожыне, сціплыя рэшткі лагойскага котлішча, маляўнічыя руіны ў Рудні на той самай Валожыншчыне ды яшчэ хіба дамок у Белавежскай пушчы. Віной таму не толькі людзі ды час, але і абставіны: амаль усе ацалелыя маёнткі Тышкевічаў апынуліся па той бок літоўскай мяжы. Як сведчыць наша вандроўка па абшарах былой "латыфундыі", многія з іх зведалі звыклыя для беларускіх рэалій праблемы.

Канцэпцыя аднаго

Настальгічны плагіят

Не даязджаючы да Вільнюса, збочваем у напрамку Тракая, увесь час наракаючы на празмерна інтэнсіўны аўтатрафік ды катастрафічны брак указальнікаў — не толькі "карычневых" — да помнікаў спадчыны ды аб'ектаў атракцыі, — але і хоць якіх. Відавочна, гэта зусім не той замежны досвед, які належыць пераймаць асобам, адказным за інфармацыйнае забеспячэнне беларускіх турмаршрутаў. Як і яшчэ адно распаўсюджанае ў суседзяў "ноу-хау": указальнікамі зазвычай "забываюць" забяспечыць менавіта праблемныя аб'екты. На Беларусі такой дыферэнцыяцыі няма — і не трэба.

У нашым выпадку ролю інфармацыйнага забеспячэння выканаў мясцовы хлопец на веласіпедзе, які пагадзіўся выступіць праваднікам. Дзякуючы яму мы ўсяго пасля паўгадзіны блуканняў апынуліся перад фасадам палаца сядзібы пад назвай Вака ў вёсцы Траку Воке.

У гэты момант не раўнуючы кожны наш суайчыннік мае ўсе падставы спазнаць эфект дэжавю. Нешта падобнае ён ужо бачыў — у сядзібе Умястоўскіх у Жамыслаўлі, за пару кіламетраў ад мяжы, але з "нашага" боку. Яно і не дзіва: і першы, і другі палац — не больш чым рэплікі варшаўскіх Лазенак. Папулярны ў XIX стагоддзі архітэктар Леандра Марконі, што называецца, набіў руку на такіх аб'ектах, выкарыстоўваючы настальгічныя настроі віленскай шляхты. Зрэшты, гэты відавочны плагіят сёння выклікае хутчэй замілаванне, чым абурэнне.

Захаванасць створанага Тышкевічамі культурнага ландшафту — зайздросная. Нават уязная алея сёння выглядае амаль так, "як было задумана". Аднак у летні пятнічны дзень сядзіба пакідае дзіўныя ўражанні. Некаторыя з яе пабудоў закінуты, некаторыя — выкарыстоўваюцца пад жытло. Сам палац больш-менш дагледжаны: сталярка — новая, дах нібыта не цячэ, але... вакол ні душы, і дзверы зачынены…

Яшчэ гадоў з дзесяць таму палац перадалі Задзіночанню літоўскай шляхты для стварэння там тэматычнага культурнага цэнтра. Ідэя, бясспрэчна, добрая, падобныя задумы ўжо які год лунаюць і ў нашым паветры. Аднак… Ці не занадта амбітны гэты праект для грамадскай арганізацыі? Ва ўсялякім выпадку, графік працы згаданага Цэнтра застаўся для нас загадкай.

Наталіўшыся цішынёй, рушым далей, нават не спадзеючыся, што праз лічаныя кіламетры нас чакае куды больш цікавая рэпліка. Гэтым разам першакрыніцай сталі англійскія замкі часоў позняй готыкі.

Вака — нядрэнная рэпліка ў адказ варшаўскім Лазенкам, а таксама нашаму палацу Умястоўскіх у Жамыслаўлі.

Гатычны "адвіс сківіцы"

Мястэчка Лентварыс, або Ляндварава, — па-ранейшаму белая пляма на турыстычнай карце Літвы. Гэта здзіўляе не толькі таму, што яно месціцца на "пратаптаных сцяжынах": акурат пасярэдзіне шляху ад Вільнюса да Тракая. Нават той чалавек, які бачыў сотні сядзіб на Беларусі ды ў яе ваколіцах, атрымае гарантаваны "адвіс сківіцы", угледзеўшы з дарогі стромкі шпіль, што ўзвышаецца па-над вялізнай сажалкай — прадуманым шэдэўрам ландшафтнага дызайну. Такога ў нашых ваколіцах больш і блізка нідзе не ўбачыш! Граф Уладзіслаў Тышкевіч меў густ, прычым — арыгінальны...

Свой цяперашні выгляд палац набыў толькі напрыканцы XIX стагоддзя, але неагатычная стылізацыя была настолькі датклівай, што, разглядаючы рыцарскія картушы ды іншыя дэталі дэкору, і сапраўды пераносішся ў позняе Сярэднявечча. Гэтаму добра спрыяе і атмасфера запусцення, якая пануе ў палацы ды яго ваколіцах, дзе, прадзіраючыся праз крапіву, можна адшукаць таксама паўнавартасную замкавую вежу (былы скарбец) і цікавыя малыя архітэктурныя формы, што ўпрыгожвалі шыкоўны некалі парк.

Вялізны гаспадарчы двор, размешчаны непадалёк ад палаца, некалі таксама выглядаў па-гатычнаму пампезна. У некаторых будынках па-ранейшаму жывуць людзі, хаця тыя камяніцы руйнуюцца, здаецца, літаральна на вачах. Тыясія даўно ператварыліся ў руіны, зарослыя баршчэўнікам у рост чалавека, іншыя ж закінуты і паступова становяцца руінамі…

Фабрыка дываноў, якая гаспадарыла ў сядзібе за савецкім часам, пакінула яе ў памысным стане. Праблема ж падсцерагала там, дзе чакалася вырашэнне. Ужо даволі даўно сядзібу набыў буйны літоўскі прадпрымальнік, праанансаваўшы зразумелы намер стварыць там шыкоўны турцэнтр. За дзяржаўны кошт былі праведзены навуковыя доследы, якія павінны папярэднічаць распрацоўцы праектна-каштарыснай дакументацыі. А далей... Усё неяк і заглухла. Як распавялі нам мясцовыя жыхары, новага "пана" даўно ўжо ў маёнтку не бачылі…

Дакладна такая ж самая сітуацыя здарылася і з класіцыстычным палацам Тышкевічаў у Нямежысе — літаральна за два крокі ад мінскай трасы. Здавалася б, суседства з Вільнюсам — гарантыя запатрабаванасці тураб'екта, але ў дадзеным выпадку справа абмежавалася толькі новым зялёным дахам. Нямежскі палац вось ужо які год стаіць закінуты, хаця і належыць буйной бізнес-структуры.

Які далейшы лёс гэтых помнікаў спадчыны, сказаць пакуль цяжка — асабліва ў тым выпадку, калі інвестары не будуць спяшацца "размарожваць" свае праекты. Безумоўна, падобная сітуацыя можа здарыцца і з любым беларускім маёнткам, які ў апошнія гады адышоў у прыватную ўласнасць, балазе іх ужо некалькі дзясяткаў. І менавіта таму ўзнікае пытанне: ці не час задумацца пра нейкі юрыдычны механізм, які "натхняў" бы інвестараў выконваць свае абавязкі?

Зрэшты, у выпадку з гэтымі маёнткамі "дугі Тышкевічаў" варта адзначыць і яшчэ адну акалічнасць: яны хаця і не выкарыстоўваюцца, але ж і разбураюцца не так хутка, як многія нашы "незапатрабаваныя" сядзібы — хаця б той самы палац у Жамыслаўлі. Бо вокны пазабіваныя, дах не цячэ... У Ляндвараве ўласнік нават расстараўся на жалезную агароджу (якая, зрэшты, хіба распаліла вандалаў, і мы яе ўбачылі ўжо паваленай). Варта адзначыць, што для Літвы такі стан рэчаў — тэндэнцыя. Закінутых маёнткаў там не менш, чым у нас, іх праблемы вырашаюцца вельмі павольна, але… На шыфер ды негабляваныя дошкі ў большасці выпадкаў такі-знаходзяцца "час ды натхненне"…

…Урэшце, апошняму звяну з "абоймы Тышкевічаў" — сядзібе Затрочча, або Ужутракай, размеш-

На людным месцы

"Брыз" пасябраваў з "Соаре"

Па запрашэнні Думы самакіравання Ікшкільскага краю Латвійскай Рэспублікі дэлегацыя Столінскага раёна наведала з афіцыйным візітам гэтыя мясціны і прыняла ўдзел у святкаванні Дня горада Ікшкіль.

СТОЛІНШЧЫНА

Пад час візіту ў Латвію адбылася сустрэча са старшынёй Ікшкільскага самакіравання Індулісам Трапіньшам, прадпрымальнікамі і кіраўнікамі таварыстваў, актыўнай моладдзю. Падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Ікшкіле і Столінам для абмену вопытам, наладжвання кантактаў у галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, адукацыі, культуры, аховы здароўя, спорту і турызму, маладзёжнай палітыкі, мясцовага кіравання і самакіравання, экалогіі, рацыянальнага выкарыстання і ўзнаўлення прыродных рэсурсаў.

Выступае народны інструментальны ансамбль "Брыз".

Быў зачытаны адрас старшыні Столінскага райвыканкама Рыгора Пратасавіцкага жыхарам Ікшкільскага краю. "Нас аб'ядноўваюць гістарычныя, духоўныя і культурныя сувязі. Спадзяёмся, што сяброўскія адносіны, якія ўсталяваліся паміж нашымі рэгіёнамі, не толькі захаваюцца, а і набудуць новыя кірункі", — гаворыцца ў пасланні.

Вельмі цёпла латышы прынялі народны інструментальны ансамбль "Брыз". Спецыяльна да паездкі ўдзельнікі ансамбля развучылі латышскую народную песню, чым асабліва парадавалі гаспадароў.

Надоўга запомніцца дэлегацыі экскурсія ў Рыгу, Юрмалу, наведанне залы "Дзінтары", прагулка на плыце па рацэ Даўгава, Рыжскім узмор'і і купанне ў хвалях Балтыкі. Для "Брыза" ж знаходжанне ў Латвіі прынесла творчае знаёмства з удзельнікамі маладзёжнага хору "Соаре".

Галіна ГАШЧУК
Столін

Сёння і заўтра ў Мінску — свята вулічных тэатраў з нагоды Дня горада! Гэта — апошнія сёлетнія выхадныя на пешаходнай вуліцы Карла Маркса, а таксама — фінал Мінскага форуму вулічных тэатраў.

На пешаходнай!

Глядач зможа ўразіцца майстэрствам акцёраў Беларусі і замежжа, карнавалам, выступленнямі перформераў. Падзея — першы ў Беларусі вопыт правядзення тэатральнага фэсту ў вулічным фармаце.

Ахвотныя далучыцца да мастацтва вулічнага тэатра змогуць паўдзельнічаць у майстар-класах разам з артыстамі. Калектывы працуюць у жанрах інтэрактыўнага тэатра, буфанады, клаўнады, тэатра лялек, пластычнага тэатра, гістарычнай рэканструкцыі ды іншых.

Ло ЯНЬ, студэнт 3 курса Інстытута журналістыкі БДУ

маршруту на памежжы

чанай літаральна "праз возера" ад Тракайскага замка, — пашчасціла куды больш за ўсе папярэднія. Пару гадоў таму яе адкрылі пасля рэстаўрацыі, і цяпер гэта шыкоўны турыстычны аб'ект. Маёнтак пазіцыянуюць як адзін з найлепшых узораў сядзібна-паркавага мастацтва Літвы, "свой Версаль" і г.д. Натуральна, гэта не больш чым звычайны піяр. Сядзіба па ўсіх параметрах саступае згаданым вышэй перлінам, і ашаламляльных архітэктурных рашэнняў там не знойдзеш. Проста, яна трапіла ў добрыя рукі.

Гэтая заканамернасць мае інтэрнацыянальны характар. Вось і сціплыя рэшткі гаспадарчага двара Ленскіх у вёсцы Сула на Стаўбцоўшчыне сёння выглядаюць куды прывабней за самавіты, але занядбаны маёнтак таго самага роду Белая Вака, які таксама трапіўся на маршруце.

Англійская готыка палаца Тышкевічаў.

Шклопакеты ў ліштве відавочна не аўтэнтычныя.

Вільнюскія кантрасты

Дабраўшыся ўрэшце да сталіцы колішняга Віленскага краю, мы пераканаліся ў тым, што яна па-ранейшаму жыве сваім нязмушаным натуральным жыццём. Горад нібыта ўбірае ў сябе плыні турыстаў з усяго свету, а не імкнецца кроў з носу ім дагадзіць — і менавіта гэтым прываблівае. Тыповая карціна, якая перадае ўвесь каларыт сённяшняга Вільнюса, — стары абшарпаны дворык за два крокі ад вуліцы Пілес, дзе чыясьці бялізна сушыцца ўсутыч са столікамі прыстойнай кавярні… У нас такое пакуль уявіць немагчыма.

Пра адметнасці горада можна прачытаць у шматлікіх турдаведніках. Каб не складаць ім канкурэнцыю, мы вырашылі засяродзіць увагу на тых мясцінах, куды турыстаў ніхто не імкнецца завабіць — наадварот, могуць яшчэ і папярэдзіць, што "снэг башка пападзёт". Гутарка — пра забудову (пераважна драўляную) колішніх віленскіх прадмесцяў, якія на сёння яшчэ захавалі свой каларыт, а вось заўтра…

Кантрасты Вільнюса кідаюцца ў вочы нават міжволі. За два крокі ад праспекта Гедыміна прытулілася старэнькая хацінка, што адлюстроўваецца ў шкляных сценах хайтэкаўскага бізнес-цэнтра. Хацелі зрабіць мастацкае фота, але тут прыехаў гаспадар хацінкі — між іншым, на добрай машыне…

Жыхары віленскага прадмесця Шніпішкі — гэта насупраць праз Вілію — таксама нядобразычліва касавурацца на чалавека з фотакамерай, толькі ўжо крыху з іншай прычыны. Раён лічыцца "праблемным", і каб не спраўджваць гэтыя характарыстыкі на сабе, пры яго наведанні часам даводзілася "ўключаць фарсаж".

А здымаць там ёсць што: у тых мясцінах яшчэ захаваліся па-вясковаму ўтульныя закуткі, забудаваныя цікавымі драўлянымі дамкамі стогадовай даўніны. І паралелі паміж такімі самымі "анахранічнымі" закуткамі ў гомельскім Свістку альбо гродзенскім Новым Свеце напрошваюцца самі сабой. Уласна, менавіта гэтым і была вытлумачана наша цікавасць: як вядома, праблемы захавання асяроддзевай драўлянай забудовы вельмі моцна даюцца ў знакі на Беларусі, выклікаючы бурлівую палеміку.

На жаль, ніякіх арыгінальных варыянтаў іх вырашэння нам не ўдалося пабачыць ні ў Шніпішкес, ні ў суседнім Жвярынасе — яшчэ адным колішнім прадмесці, якое за апошняе стагоддзе заканамерна "наблізілася" да цэнтра. І наўрад ці хто аспрэчыць нашу заканамерную выснову: каларыт гэтых мясцін паступова знікае…

"Вясковыя" паводле свайго духу Шніпішкі канцэптуальна стастарэлі ўжо гадоў пяцьдзясят таму, і архітэктары сталі будаваць грандыёзныя планы поўнага перайначвання раёна: з глухамані — у "новы цэнтр" Вільнюса. Рэалізаваліся яны толькі часткова, пакінуўшы па сабе пару сучасных — для савецкага часу — пабудоў. У новым тысячагоддзі да іх далучыліся "хайтэкаўскія" высоткі, у тым ліку — і найвышэйшая ў Прыбалтыцы шкляная вежа "Еўропа".

Логіка тут зразумелая: з аднаго боку, у крокавай даступнасці ад Старога горада з яго галоўнымі турадметнасцямі, з іншага — усё ж па-за тэрыторыяй аб'екта са Спіса UNESCO. Зрэшты, "схаваць" тыя высоткі так і не атрымалася, і пад час шпацыру па Вастрабрамскай яны раз-пораз няўмольна нагадваюць пра сябе, нечакана з'яўляючыся ў полі спазору ды парушаючы "ідылію даўніны".

Але галоўны пра(ы?)кол у іншым: менавіта ў тых самых кантрастах. Ледзь не ўсутыч з архітэктурным гімнам прагрэсу мы і сёння бачым поўны яго антыпод: вузкія вулачкі без асфальтавага пакрыцця, пахіленыя хацінкі з выгодамі на вуліцы... Відавочна, у планы інвестараў умяшаўся эканамічны крызіс.

Нешматлікія "аматары даўніны" паціраюць рукі: няўжо захаваецца? Але радавацца ім няма чаму. Відаць, што "адтэрміноўка выраку" гэтаму раёну носіць толькі часовы характар, і рана ці позна яго чакае лёс адфарматаванай флэшкі. Часам у літоўскім друку гучаць прапановы захаваць хаця б частку старога каларыту, пераўтварыўшы "трушчобы" ў турыстычны аб'ект. Але паколькі да канкрэтыкі ім далёка, а вырашэнне лёсу праблемнага раёна і без таго ўжо зацягнулася на доўгія дзесяцігоддзі... Тут прагнозы зразумелыя.

У суседнім раёне з сакавітай назвай "Звярынец" (некалі там былі паляўнічыя ўгоддзі Радзівілаў) сітуацыя крыху іншая: высотак тут ніхто будаваць не збіраецца. Знішчэнне даўніны адбываецца павольным, "паўзучым" чынам: дом з прыгожымі ліштвамі, што атачаюць пластыкавыя шклопакеты, — гэта ўжо не помнік, а нонсэнс. Ліштваў становіцца ўсё менш, а шклопакетаў — наадварот.

Зрэшты, тут не трэба спяшацца праводзіць паралелі з нашымі рэаліямі. Хаця б таму, што ў Вільнюсе і без таго не бракуе турыстычных прынад. Прычым іх лік пастаянна прырастае за кошт тых самых прадмесцяў — згадайма хаця б адносна новы забаўляльны парк Бяльмонтас, што ўключыў колішні млын і пакуль не дабраўся да руін людвісарні.

Гомель або нават Мінск такой раскошай, на жаль, не валодаюць, што ў дадзеным выпадку можа азначаць толькі адно: права на "ноу-хау" тут належыць нам. І калі літоўскія госці праедуцца на концы па Паўночным завулку або Спасавай слабадзе, пасядзяць там у карчме ды адчуюць, як прыемна пахне з грубкі пасярод сучаснага места… Тады, магчыма, і віленскія кантрасты набудуць нейкае больш прывабнае аблічча — вядома, калі дажывуць да той светлай пары.

■■■

Інтэрнэт-пошукавікі ахвотна выдадуць вам інфармацыю пра "беларускую Вільню": тыя адрасы, што непасрэдна звязаны з выбітнымі падзеямі альбо постацямі нашай культуры. Ужо даўно распрацаваны і адмысловыя экскурсіі. Вось толькі, на жаль, пакуль яны не сталі масавымі — прымяняльна нават да тых нашых суайчыннікаў, якія выпраўляюцца ў туры па Прыбалтыцы. І таму апошнія здзіўляюцца, знаходзячы столькі "беларускіх" мемарыяльных дошак на віленскіх вуліцах.

Надзвычай важныя для нашай гісторыі мясціны турыст на хуткасці прамінае і па дарозе з Мінска ў Вільнюс. Мемарыяльных дошак з беларускім тэкстам там пакуль няма. Пра тыя "прызабытыя" месцы — у наступнай "серыі" нашых падарожных нататак.

Ілья СВІРЫН, Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, нашы спецыяльныя карэспандэнты
Шальчынінкайскі раён — Вільнюскі раён (Літва)
Фота аўтараў

З чаго ўсё пачынаецца?

З чаго пачынаецца бібліятэчная справа? З людзей, якія ёй служылі і служаць. Бібліятэкар — праваднік у свет ведаў ды прыгажосці. Гэта ён адкрывае і здабывае слова, гэта да яго прыходзяць людзі са сваім радасным ці набалелым. Такая прафесія. Час патрабуе ад нас прафесіяналізму ды аўтарытэту, а людзі — чалавечнасці і паважлівых адносін.

У 2009-м у Смаргоні ладзіўся Дзень пісьменства. Мы сустракаліся з пісьменнікамі, паэтамі, журналістамі, выдаўцамі. Свята паўплывала і на дзейнасць бібліятэк Смаргонскай ЦБС. Сталася традыцыяй запрашаць у бібліятэкі літаратараў, пісьменнікаў, музыкантаў, знакамітых людзей краіны, горада ды раёна.

Адбылося спатканне з нашым земляком, пісьменнікам і публіцыстам, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Аркадзем Жураўлёвым. Чытачы дакрануліся да беларускага слова, паслухалі абразкі, навелы, пейзажныя замалёўкі. Сустрэчу з беларускімі літаратарамі Віктарам Шніпам і Людмілай Рублеўскай "Праз душу, праз вершы, праз Сусвет" правялі для сваіх чытачоў супрацоўнікі РЦБ. А ў рамках Фестывалю праваслаўнай культуры "Кладезь" у РЦБ прайшлі дзве сустрэчы з дзіцячай пісьменніцай Таццянай Дашкевіч.

У Войстаме адбылася сустрэча з Генадзем Пашковым і групай мінскіх літаратараў, у Солах ладзіўся вечар-партрэт, прысвечаны мясцоваму паэту і публіцысту Мар'яну Дуксу.

"Там, дзе Беларусь мая, там і я" — пад такой назвай працавала Літаратурная гасцёўня з удзелам Міхася Пазнякова. Адбыліся сустрэчы з літаратарамі Леанідам Дранько-Майсюком і Эдуардам Акуліным, са скульптарам Уладзімірам Церабуном.

Летась у рамках Года кнігі нашы бібліятэкі прынялі ўдзел у Абласным літаратурным конкурсе да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Маладыя аўтары прадставілі вершы, эсэ, водгукі на творы. Як вынік — з'явіўся буклет "Песнярам роднай зямлі…".

Святам Дня бібліятэк стала падвядзенне вынікаў раённага конкурсу на лепшае літаратурнае віншаванне "Праздника хотят все". Бібліятэкары парадавалі наведвальнікаў сваімі выступленнямі: гумарам, вершамі, песнямі, інсцэніроўкамі.

На пачатку ж гэтага года быў аб'яўлены конкурс "Суперчытач-2013", падвядзенне вынікаў якога прымеркавана да Дня бібліятэк.

Таццяна КАМАРОЎСКАЯ, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Смаргонскай ЦБС

Лічбавае кіно ў Мазыры

Новая лічбавая зала мазырскага кінатэатра "Мір" прыняла гледачоў. Прэм'ерным фільмам для адкрыцця стала стужка Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" "Сляды апосталаў" Сяргея Талыбава.

Як распавяла дырэктар "Мазыркінавідэапракату" Наталля Чысцякова, карціна "Сляды апосталаў" адкрывае кінафестываль "70 гадоў без вайны", які стартаваў у Гомельскай вобласці 5 верасня. У наступным яе паказы ў кінатэатры плануюцца ў даты вызвалення раённых цэнтраў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ранейшая прэзентацыя стужкі адбылася на "Славянскім базары ў Віцебску", а таксама ў Быхаве пад час імпрэз на Дзень пісьменства.

Найноўшае кінапраекцыйнае абсталяванне кінатэатра "Мір" цяпер дазваляе дэманстраваць стужкі розных фарматаў. Пасля рамонту ў зале з'явіліся лічбавы праектар для паказу 2D/3D-кантэнту, лічбавы кінасервер, перфараваны, бясшвовы экран ды іншае. Абнаўленні ўжо прыцягнулі вялікую колькасць наведвальнікаў. "Мы ўпэўнены, што кінатэатр будзе карыстацца папулярнасцю. Мэтавая аўдыторыя — шырокая. Людзі жадаюць глядзець сучаснае кіно добрай якасці, з добрым гукам", — адзначыла Наталля Чысцякова.

Пасля паказу першай стужкі ў адноўленай кіназале адбылася сустрэча з прадстаўнікамі творчай групы фільма "Сляды апосталаў" Таццянай Чардынцавай, Зміцерам Пусцільнікам, Яўгенам Іўковічам.

Вольга НАВІЦКАЯ

У гэтым доме паэт правёў дзіцячыя гады. Бацькоўская хаціна гарэла, была ўзноўлена на старым падмурку і сагрэта сэрцамі мясцовых музейшчыкаў... Мікалай ГАЙБА — восьмы дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча, што поруч з мясцовым замкам, пакручастымі вуліцамі ды старасвецкай архітэктурай будынкаў і храмаў пераўтварае Навагрудак у непаўторную музейную прастору. Не ўсё з інфраструктуры даведзена да ладу, і статус "горад-музей" пакуль не мае афіцыйнага падмацавання, але неаспрэчна адно: Музей Міцкевіча — адна з наведваемых культурных устаноў раённага цэнтра...



Майстар-клас дырэктара музея

Камерцыйная разваротлівасць і сенсарныя экраны

— Мікалай Паўлавіч, што павінен умець сённяшні дырэктар музейнай установы?

— Быць гаспадаром. На яго і падначаленыя глядзяць, і кіраўніцтва, і насельніцтва. Тут адной навуковай эрудыцыі, напэўна, мала. Трэба нешта і сваімі рукамі рабіць, бо штаты ў раённых установах — невялікія… А мы ў цэнтры горада працуем, значыць — навідавоку. Таму гаспадарчым спосабам імкнёмся падтрымліваць сваю ўстанову ў належным стане. Санвузлы давялі да ладу. Але чарговы галаўны боль — састарэлыя камунікацыі. Апошні капітальны рамонт праводзіўся ў музеі больш за дваццаць гадоў таму… Так што даводзіцца сумяшчаць абавязкі музейшчыка і гаспадарніка.

— Музей мае немалы падворак. Наколькі ўдалося яго "ажывіць"?

— Так, у нас тут і альтанка ёсць, і клець. У першай ужо заключаюцца шлюбы. У другой мяркуем размясціць этнаграфічную экспазіцыю. Тут з'явяцца архаічныя побытавыя рэчы часу міцкевічаўскага дзяцінства. Частка іх, як вы ведаеце, прэзентуецца на вароўні, у падвальным памяшканні музейнага будынка... Натуральна, хочацца, каб усё гэта жыло і дыхала. Музейныя заняткі для школьнікаў мы вядзём даўно. Але ёсць жаданне ўключыць у музейную дзею і наш падворак, дзе месца знойдзецца і майстрам-рамеснікам з узорамі іх народнага мастацтва. А такая паслуга, як фотасесія, у нас дзейнічае ўжо не адзін год.

— З чым атаясамліваеце сваю ўстанову? З прыязным сябрам, з самім Міцкевічам ці са строгім мемарыялам, да якога без піетэту і не падысці?

— У назве прысутнічае слова "дом". Гэта вымагае ад навагрудскай установы двайной, трайной адказнасці... Дый і сама наша экспазіцыя падпарадкавана строгім побытавым законам беларускага жытла. А яно павінна быць прыязным, цёплым, утульным, зручным, гасцінным. Якімі б доўгімі ні былі вандроўкі, усе яны заканчваюцца вяртаннем дадому... Словам, стаўленне да музея — як да рэчы і з'явы сакральнай. Дом — не як будыніна, а як выток жыцця, як пачатак здзяйснення самых неверагодных мар...

> Мы таксама думаем пра тое, каб у кожнай нашай зале меліся сэнсарныя экраны, каб можна было, націснуўшы, і фільм паглядзець, і музыку паслухаць...

— Што, і дамавік у вас ёсць?

— А як жа! Прынамсі, начныя вартаўнікі пра гэта сцвярджаюць без жартаў…

— З 2007 года ўстанова стала юрыдычнай асобай. Ці шмат клопату ў вашага галоўнага бухгалтара? І ці рэальна казаць пра перспектыўную самаакупнасць Дома-музея? Або на гэта здольныя толькі прыватныя ўтварэнні?

— Я ўсё ж лічу, што музей, створаны дзяржавай, павінен дзяржаўнай уласнасцю і заставацца. Аднак гэта не азначае, што камерцыйная разваротлівасць музейшчыку толькі замінае. Наша ўстанова мае чатырнаццаць працэнтаў самаакупнасці. Гэта — удвая вышэй за сярэдні абласны паказчык сярод устаноў культуры... Самаакупнасць, пагадзіцеся, патрабуе рашучага змянення нашай стратэгіі і тактыкі. Да прыкладу, у разы павялічыла б музейныя прыбыткі кавярня, але вольных памяшканняў для яе ўладкавання няма...

— Асноўныя прыбыткі — ад продажу білетаў?

— Безумоўна. Для дарослых ён каштуе 12 тысяч рублёў. А за год Дом-музей Міцкевіча наведвае ў сярэднім 22 тысячы чалавек... Але збольшага гэтыя грошы ідуць не толькі на далейшае развіццё нашай гаспадаркі, а і на ўтрыманне будынка, заахвочванне супрацоўнікаў. Летась пазабюджэт дасягнуў 95 мільёнаў рублёў.

— Колькі замежнікаў сярод наведвальнікаў?

— Кожны шосты. Вы ж ведаеце, што экскурсіі мы ладзім на беларускай, англійскай, польскай, рускай мовах.

— Ці адбіваецца замежны ўплыў на папаўненні экспазіцый?

— Канешне. Да прыкладу, у нас нядаўна з'явіўся "Пан Тадэвуш" на кашубскай мове. А ўсяго маем 15 перакладаў паэмы Міцкевіча, у тым ліку і на азербайджанскай — гэта падарунак ад тамтэйшай моладзі.

— Сакральнасць сакральнасцю, але інтэр'ерам Дома не пашкодзяць, відаць, і навінкі інфармацыйных тэхналогій, без якіх любы замежны музей цяпер немагчыма і ўявіць?

— Днямі мне давялося наведаць шэсць польскіх гарадоў і пятнаццаць тамтэйшых музеяў. Практычна ва ўсіх працуюць інтэрактыўныя сенсарныя экраны... Мы таксама думаем пра тое, каб у кожнай нашай зале дзейнічалі гэткія ж, каб можна было, націснуўшы, і фільм паглядзець, і музыку паслухаць... Дарэчы, пасля экскурсій часта развітваемся з гасцямі невялічкім салонным канцэртам, які ладзяць для нас музыканты горада. Але ж гэта не азначае, што ў сучаснай тэхніцы патрэбы мы не маем.

— Колькі такая камп'ютарная раскоша будзе каштаваць?

— Ад 15 мільёнаў рублёў.

— Мікалай Паўлавіч, а спонсары ў вас ёсць?

— Я хацеў бы аддзячыць нашаму будаўніча-мантажнаму ўпраўленню, лясгасу, сельскагаспадарчаму ліцэю, школе № 1... Гэтыя арганізацыі шмат рабілі і робяць па добраўпарадкаванні нашай тэрыторыі.

— У вас ёсць юрыдычныя правы на назву "Дом-музей Адама Міцкевіча"?

— Ёсць дамова з майстрамі-сувеніршчыкамі, каб частку сваіх твораў з такім надпісам яны рэалізоўвалі менавіта ў нашым музеі. Вялікіх прыбыткаў ад гэтага не займеем ні мы, ні яны...

— Якой бачыцца бліжэйшая музейная перспектыва?

— Пра неабходнасць капітальнага рамонту я ўжо казаў. Другі кірунак — больш творчы. Адна студэнтка мінскай ВНУ праходзіць у нас пераддыпломную практыку і рыхтуецца да абароны праекта "Добраўпарадкаванне тэрыторыі Дома-музея Адама Міцкевіча". З яе дапамогай мяркуем якасна змяніць ландшафт нашага падворка.

— І апошняе. Некалькі гадоў таму мы былі з вамі на Свіцязі, бачылі закінуты рэстаран на ўзбярэжжы. Што змянілася з таго часу?

— Там будуецца буйны туркомплекс з самым шырокім спектрам паслуг. Думаем, што месца там знойдзецца і для нашай экспазіцыі…

Гутарыў Яўген РАГІН
Фота Юрыя ІВАНОВА
і з архіва суразмоўцы

"К" вырашыла звярнуцца да кожнага начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, каб высветліць, у якіх генеральных кірунках збіраецца дзейнічаць нядаўна пераструктураваная райвыканкамаўская адзінка. Кагосьці з кіраўнікоў мы даўно і плённа ведаем, хтосьці толькі прыглядаецца да новай дзялянкі працы... "К" працягвае знаёміцца не толькі з кадрамі, але і з іх прыярытэтамі развіцця рэгіянальнай культуры.

Стратэгія начальніка аддзела

Характар штодзённага

Надзея ЖУК, Кобрынскі райвыканкам

— Пачну з выключна важнага, на мой погляд, моманту нашай штодзённай дзейнасці: з ідэалогіі. Яна — у нашых традыцыях, мове, мастацтве. Культура — тая субстанцыя, што грэе душу. А мы працуем для людзей і павінны зрабіць усё, каб ім было ўтульна ў нашай дзяржаве. І менавіта для гэтага неабходна ўсяляк развіваць інфраструктуру рэгіёнаў, удасканальваць сетку сацыяльных інстытутаў у аграгарадках: школ, крам, клубаў, бібліятэк…

Кожная вёска — асяродак традыцыі, культуры, адмысловай гаворкі і народнай мудрасці, на якой трымаецца наша жыццё. Захаваць такую вёску — таксама ідэалогія. Мы цяпер масава праводзім святы вёсак, ушаноўваем людзей працы, шматдзетныя сем'і, юбіляраў. Выкарыстоўваем для гэтага найлепшыя творчыя сілы.

> Экспарт народнага мастацтва раёна за мяжу — таксама ідэалогія. І ў тым, што суайчыннікі ў Польшчы спяваюць нашы песні, — доказ жыццяздольнасці падобных стасункаў.

Рыхтуемся да Дзён еўрапейскай спадчыны, што пройдуць 26 — 28 верасня. З нагоды 20-годдзя ратыфікацыі Еўрапейскай культурнай канвенцыі запланавалі акцыю "Беларусь самабытная", прысвечаную нашай нематэрыяльнай культурнай спадчыне.

Экспарт народнага мастацтва Кобрыншчыны за мяжу — таксама ідэалогія. І ў тым, што беларускія суполкі ў Польшчы з поспехам спяваюць нашы песні, — доказ жыццяздольнасці стасункаў такога роду. Мы пастаянна ездзім з гастролямі за мяжу, а нашы сябры — з творчым прывітаннем да нас. Культура лучыць, выхоўвае і стварае нам станоўчы імідж…

Не так даўно правялі традыцыйны маладзёжны форум. Як і штогод, ля аквапарку сабраліся аматары альтэрнатыўнага мастацтва. Форум называецца "Вольны рух" і аб'ядноўвае графіцістаў, паркурыстаў, брэйк-дансераў, прадстаўнікоў іншых відаў маладзёжнай субкультуры. За апошні час мерапрыемства набыло рэгіянальны характар, прыцягнула ўвагу юнакоў і дзяўчат з іншых рэгіёнаў… Карацей, калі такое мастацтва спрыяе спартыўнай загартоўцы, калі яно запатрабавана сярод маладых, дык убаку мы ніяк не застанёмся. "Вольнаму руху" — жыць і развівацца!..

Вось такія прыярытэты дзейнасці нашага аддзела на мяжы лета і восені. І яшчэ раз падкрэслю: развіваецца нацыянальная культура — мацуецца свядомасць беларускага народа.

Не сакрэт, што ў свядомасці многіх нашых суайчыннікаў сельскія бібліятэкі, дамы культуры і клубы з'яўляюцца нейкімі рэліктамі з савецкіх часоў. Маўляў, дзе яшчэ ў Еўропе сустрэнеш такія, скажам, далёка не самаакупныя ўстановы? Але ці так яно на самой справе? Паразважаць пра замежную сістэму рэгіянальных устаноў культуры на прыкладзе Румыніі "прымусіў" адпачынак у гэтай краіне, якая, да слова, уваходзіць у Еўрапейскі саюз. Пагадзіцеся, не ўсё ж бавіць час ля мора...

Будынак бібліятэкі і Дома культуры ў румынскім курортным горадзе Эфарыя Суд.

Каралева СДК

Вольны столік для **культурнай рэтраспекцыі**

Курортны гарадок Эфарыя Суд, куды давялося трапіць, вядомы з канца XIX стагоддзя. Цікава, што з 1928-га курорт некалькі дзесяцігоддзяў насіў назву Кармэн Сільва — у гонар літаратурнага псеўданіма Каралевы Румыніі Лізаветы, якая кожны год там адпачывала. Сёння пра гэта нагадвае шыльда якраз на будынку мясцовай бібліятэкі і колішняга Дома культуры.

Знайсці апошнія — справа не вельмі простая, тым больш — для замежнага турыста, нават нягледзячы на тое, што размяшчаюцца яны ў будынку пачатку XX стагоддзя на цэнтральнай пешаходнай вуліцы. Але пры гэтым — ніякіх кідкіх шыльд і тым больш указальнікаў. Адразу з'явілася думка, што арыентуюцца гэтыя ўстановы пераважна на старых жыхароў Эфарыі Суд, лік якіх — блізу трох тысяч чалавек (чым не аналаг якога-небудзь беларускага аграгарадка?). Пацвердзілася гэтае меркаванне і пад час гутаркі з супрацоўніцай бібліятэкі Марыяй Дыметрэску, а таксама ўбачаным. Але пра ўсё — па парадку.

Бібліятэчны парадокс

Унутраную прастору бібліятэкі аздабляе старадаўні камін, аналаг якога можна было ўбачыць у беларускіх заможных сядзібах канца XIX — пачатку XX стагоддзя. А вось галоўныя скарбы ўстановы — кнігі — выклікалі процілеглыя пачуцці. Пераважная большасць друкаваных выданняў, прадстаўленых у бібліятэцы, пабачыла свет яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму. Актуальнае і моўнае пытанне. Знайсці кнігу на англійскай мове, ужо не кажучы пра рускую ці беларускую, так і не атрымалася. І гэта ў курортным гарадку!

А вось бібліятэкар усё ж валодае замежнымі мовамі, у тым ліку рускай. Марыя Дыметрэску падзялілася сваімі клопатамі. Аказалася, праблемы аналагічныя нашым: і малая колькасць чытачоў, найперш — моладзі, і адсутнасць капітальнага рамонту будынка, і старая камп'ютарная тэхніка, якая ўжо не тое што наведвальніка прывабіць не можа, але і справіцца з непасрэднымі задачамі бібліятэкара… Тым не менш, па словах Марыі Дыметрэску, нягледзячы на не самую вялікую папулярнасць установы, не ўзнікае пытання яе ліквідацыі ці аб'яднання, да прыкладу, са школьнай бібліятэкай. Што ж да перспектыў, то плануецца выкарыстоўваць некалькі брэндаў. Сярод іх і постаць румынскай каралевы-пісьменніцы — цудоўны прыклад для капіравання любові да літаратурнай творчасці сучаснай моладзі.

Праўда, з размовы так і не змог зразумець, чаму ж бібліятэка не арыентуецца на велізарную армію турыстаў. Да прыкладу, сямейная пара з Мурманска, што адпачывала ў Эфарыі Суд, са скрухай адзначыла адсутнасць якіх-кольвечы рускамоўных выданняў як у продажы, так і ў бібліятэцы.



Сцэна для правядзення этнаканцэртаў.

Фестывальныя рэтраспекцыі

І калі мова літаратуры з'яўляецца досыць вялікім бар'ерам у спазнанні замежнай культуры, то мова музыкі, як вядома, дазваляе паразумецца прадстаўнікам любых нацый. Менавіта такі падыход актыўна выкарыстоўваецца мясцовым Домам культуры. Пры гэтым, што немалаважна, на турыстах ДК так-сяк і падзарабляе.

Дзейнасць мясцовага ДК, які мае і свой сайт, скіравана на захаванне і папулярызацыю, найперш, традыцыйнага фальклору. Пра магчымасць арганізацыі гурткоў па ўсходніх танцах ці арыгамі там нават не захацелі размаўляць. Што ж да яскравых прыкладаў дзейнасці ДК, дык нельга не згадаць Нацыянальны фальклорны фестываль "Спеў і гульня Доброгеан", які сёлета праводзіўся з 20 па 26 чэрвеня і сабраў выканаўцаў народнай музыкі з усёй краіны. Пры гэтым канцэртныя выступленні адбываліся на розных сцэнах: і ў будынку мясцовага тэатра, і на адкрытых пляцоўках, у тым ліку навакольных населеных пунктаў.

З гэтым фестывалем звязаны і яшчэ адзін цікавы момант, які атрымалася ўбачыць на свае вочы, — так званы рэтраспектыўны перыяд. Яго сутнасць у тым, што кожны вечар цягам ліпеня і жніўня ў невялікім амфітэатры выступаюць удзельнікі фестывалю. "Фішка" такой рэтраспекцыі ў тым, каб, з аднаго боку, як мага шырэй прадставіць турыстам нацыянальную культуру, а з іншага — папоўніць бюджэт установы. Справа ў тым, што частку прасторы за сцэнай займаюць столікі рэстарана, таксама аздобленага ў народным румынскім стылі. (Да слова, знайсці вольны столік пад час вечаровых канцэртаў вельмі праблематычна.) Думаецца, такі падыход быў бы карысны і для ўстаноў культуры нашых курортных раёнаў, у тым ліку Мядзельскага ды Браслаўскага.

Калі працягваць гаворку пра ДК у Эфарыі Суд, дык трэба сказаць, што па шэрагу прычын ён усё ж трапіў пад вядомую айчынным установам культуры аптымізацыю. Мясцовы ДК з будынка бібліятэкі пераехаў у суседні, больш буйны, населены пункт. Тым не менш, засталіся і, самае галоўнае, выкарыстоўваюцца канцэртныя пляцоўкі, адбываюцца выставачныя праекты, у тым ліку пад адкрытым небам. Асабіста я змог у парку перад тэатрам пазнаёміцца з выстаўкай рэтра-фотаздымкаў пачатку XX стагоддзя.

Нельга не адзначыць і яшчэ адзін момант. Для любога населенага пункта, ужо не кажучы пра турыстычныя Меккі, вельмі важны продаж сувеніраў. Румынская Эфарыя Суд, па шчырасці, спраўляецца з задачай паспяхова. Праўда, на набярэжнай прадстаўлены пераважна кітайскія сувеніры, і толькі ў парку — вырабы народных майстроў. Што цікава, кошты на аўтэнтычныя ручныя вырабы значна ніжэйшыя за кітайскі "шырспажыў", а таксама (для параўнання) за аналагічную прадукцыю беларускіх майстроў...

Кастусь АНТАНОВІЧ
Фота аўтара

Рэйтынг ідэй з інтэрнэт-прасторы

Чаму б не аб'яднацца на адным сайце?

Мікалай ЗАБАЎСКІ, дырэктар Вяззеўскага сельскага дома культуры Асіповіцкага раёна, прызнанага лепшай клубнай установай аграгарадка ў 2012-м

1. Агульны доступ

Чаму б усе культурныя ўстановы краіны не аб'яднаць адзіным сайтам, ці яшчэ неяк, у тых жа сацыяльных сетках, каб мець агульны доступ да культурных навін, фільмаў, канцэртаў, фестываляў па ўсёй Беларусі? Уявіце, як добра было б, каб недзе ў адным месцы знаходзіўся б увесь гэты медыйны кантэнт! Ведаю, у Міністэрства культуры Расіі зараз ёсць падобная старонка — там выкладзены канцэртныя праграмы, усе справаздачы. Палову ж з таго, што адбываецца ў нашых рэгіёнах, няма дзе паглядзець. Проста, гэтым камусьці трэба займацца…

2. Музычнае сховішча

Добра, калі інфармацыя сканцэнтравана ў адным месцы. Дарэчы, у Сеціве можна знайсці вынікі такой плённай працы. Напрыклад, ранейшы блог Якава Навуменкі, светлая яму памяць. Артыст распачаў вялікую работу: за дваты месяцы здолеў сабраць на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы каля тысячы песень беларускіх выканаўцаў. Рабіў ён гэта з мэтай пазнаёміць усіх з выдатнай айчыннай музыкай. Там практычна анталогія нашай эстрады! Як шмат адзін чалавек зрабіў за такі кароткі тэрмін!..

3. Праца

У паўсядзённай працы без Інтэрнэту, зразумела, немагчыма: нешта патрэбна знайсці, нешта адаслаць… Дарэчы, ноты рабіць у Сеціве лягчэй. Напрыклад, калі мне патрэбна пэўная партытура для аркестра, я на спецыяльным сайце магу падбіраць да яе ноты ў рэжыме он-лайн…

4. Вызначаем густы

Інтэрнэт дапамагае нашаму Дому культуры яшчэ і ў забаўляльным аспекце. Напрыклад, праз сацыяльныя сеткі вызначаем музычныя перавагі нашых наведвальнікаў ды робім дыскатэкі па заяўках. Тое ж датычыцца і паказу мастацкіх фільмаў. Акрамя таго, апавяшчаем людзей аб навінах ды мерапрыемствах…

5. Супраца

Кантактуем праз сацыяльныя сеткі не толькі з беларускімі дамамі культуры, але і з расійскімі. Перапісваемся, дапамагаем адно аднаму, раімся. Ёсць сябры ў Гомельскай, Віцебскай, Мінскай абласцях. Праз Сеціва збіраем розныя матэрыялы, абмяркоўваем, абменьваемся спасылкамі, нотамі, фанаграмамі. А бывае, і песні ствараем разам. Напрыклад, ёсць некалькі куплетаў, але недаробленых, дык можам аб'явіць конкурс на стварэнне новых. Атрымліваецца, так бы мовіць, народная, створаная агульнымі намаганнямі, песня, якую запісваем на гатовую фанаграму, а потым абмяркоўваем вынік…

Занатавала Вольга НАВІЦКАЯ
Фота Кастуся АНТАНОВІЧА

Смачная гісторыя

Смак з часоў князя Вітаўта

"О цудоўныя мясныя маленькія тэфтэлі! Яны пахлі так цудоўна і былі такія падсмажаныя ды румяныя — словам, такія, якімі павінны быць добрыя мясныя тэфтэлі!" — так пісала Астрыд Ліндгрэн у "Малышы і Карлсане". Калі я распавядала б пра стравы шведскага стала, дык адразу перайшла б да рэцэпта журавінавага соусу — "кампаньёна" тэфтэляў, а дапоўніла рэцэптам тушанай гародніны. І дадала б, што менавіта шведы перасталі лічыць тэфтэлі "ежай другога дня і цудоўным спосабам утылізацыі мясных рэшткаў". Рэдкі выпадак у еўрапейскай кулінарыі! А яшчэ расказала б пра беларускі след у гісторыі стравы...

Пакручастае мінулае тэфтэляў звязана з Беларуссю!

Кулінарныя антраполагі ўсяго свету пагаджаюцца з думкай, што тэфтэлі — фрыкадэлькі, мясныя шарыкі — з'явіліся "на досвітку часоў", але вось пра кантынент, народнасць ці краіну не кажуць… Зрэшты, мяса ва ўсе часы было даволі дарагім, таму гаспадыні намагаліся, каб ніякая частка не прапала дарэмна. Дабаўленне да здробленага мяса крухмалу ці гародніны дапамагала павялічыць колькасць порцый.

Разнавіднасці мяса і розніца ў спосабах яго тэрмічнай апрацоўкі раскажуць нам пра геаграфію стравы. Свініна прывядзе ў Кітай. У Паўночнай Афрыцы мы ўбачылі б на стале вялікія тэфтэлі з тоўстых авечых хвастоў са спецыямі. У Старадаўнім Рыме нехта Апіцыус згадвае "мясныя шарыкі з духмянай падліўкай на праснаку", распавядаючы, што найлепшыя былі зроблены з мяса паўліна, і пералічвае ўстановы горада, дзе іх можна пакаштаваць.

Аднак намаганнямі філолагаў і лінгвістаў у якасці радзімы фрыкадэлек можна ўстанавіць Персію. Бо слова "кофт" ці "кюфта" знаёмае ва ўсім Бліжэйшым Усходзе, у Індыі ды Цэнтральнай Азіі і, верагодна, паходзіць ад персідскага "koofteh" — "бітае мяса".

Пасля доследаў антраполагам гастранаміі неабходна было пагадзіцца з некаторымі рэчамі. Папершае, сысціся на тым, што мясны шарык можа называцца тэфтэлькай, фрыкадэлькай і мець дзясяткі імёнаў. У чым розніца? У фарш для фрыкадэлек дадаюць спецыі, вострыя прыправы і зеляніну. У тэфтэлі — крупы (часцей за ўсё — рыс) ды гародніну. Другое адрозненне, больш умоўнае, — памер: тэфтэлі больш вялікія. Нарэшце, тэфтэлі тушаць, а фрыкадэлькі смажаць ці запякаюць у духоўцы. Пагадзіцца ж на тое, што аснова — здробленае ці сечанае мяса, аказалася лягчэй…

Не пералічыць таго, што дадаюць да фаршу для паляпшэння смаку. Дый спосабы прыгатавання захапляюць. У Японіі робяць біфштэкс, які называецца "hanbagu": вялікія, плоскія фрыкадэлькі. Смажаныя грэчаскія звычайна ўключаюць у сябе дробна нарэзаныя цыбулю і лісце мяты. Інданезійскія падаюцца ў чашы, з локшынай, тофу і яйкамі. У Албаніі фрыкадэлькі гатуюцца з дабаўленнем сыру фета. Польскія голабкі памерам з мандарын абавязкова будуць з рысам. У Іспаніі і Мексіцы фрыкадэлькі называюцца "альбондыгас" — ад назвы фундука. Іспанскі варыянт служыць як закускай, так і асноўнай стравай, мексіканскі — часцей сустрэнеш у талерцы з супам. Турцыя можа пахваліцца больш чым 80 відамі, кожны з якіх будзе адрозніваецца ў адпаведнасці з рэгіёнам прыгатавання. Нельга не згадаць італьянскі вясельны суп, у які таксама дадаюцца тэфтэлькі памерам з грэцкі арэх.

Найбольш паспяховыя ў перайманні арабскіх традыцый венецыянцы, якія дамінавалі на рынку гандлю спецыямі з арабскімі краінамі. Так, на свет з'яўляюцца фрыкадэлькі з лімоннымі цукатамі, кедравымі арэшкамі і нават пасыпаныя цукрам. Страва з шэрагу "звычайных, але смачных" імкліва становіцца сацыяльным маркерам, бо, акрамя незвычайнага смаку, правілы дыктавалі этыкет сервіроўкі і падачы стравы: медныя ды срэбныя падносы, цукаты і жывыя кветкі.

Аповед пра гісторыю фрыкадэлек прыводзіць у Іспанію. У залаты век краіна пераняла мноства кулінарных традыцый Усходу. У апісанні страў можна сустрэць расповед пра кавалачкі фаршу, абсмажаныя ў алеі з вострымі прыправамі.

А вось — факт. У час іспанскай інквізіцыі фрыкадэлькі гатаваліся са свініны, іх абавязкова падавалі пры вялікай колькасці народу. Упэўніўшыся, што большасць гасцей паглынае прапанаваную страву, гаспадар дома гучна казаў, што гэтыя тэфтэлі прыгатаваны са свініны. Гасцей, якія адмаўляліся есці некашэрную ежу ці спрабавалі акуратна выплюнуць пачастунак, арыштоўвалі і адпраўлялі ў турму як яўрэяў.

У XIX стагоддзі стала з'яўляцца і больш "навуковая інфармацыя". Так, Оксфардскі слоўнік у 1838-м апісаў фрыкадэлькі як "любая камбінацыя з сырога ці варанага мяса, што фарміруецца ў шарыкі".

Складана прасачыць "азіяцкую радаслоўную" фрыкадэлек. Адна з папулярных страў кітайскай кухні — "Галава льва": гэта вялікія фрыкадэлькі (пераважна са свініны), якія падаюцца з вялікай колькасцю соусу і адварной капустай. Лічыцца, што свой шлях страва бярэ ад берагоў ракі Янцзы. Кітайскім кулінарам мала даць страве назву — яны абавязкова раскажуць вам легенды, якія будуць звязаны з мужчынскім здароўем, жаночай прагнасцю ці мудрасцю імператара. Да "азіяцкіх матываў" адносяцца таксама фрыкадэлькі з рыбы ці тоўчаных крэветак.

У 1829-м быў вынайдзены рудыментарны млын — "прабабуля" сучаснай мясарубкі. А праз дваццаць гадоў мяснікі пачнуць гатаваць фарш "на заказ"…

Смачна есці!

Таша ЛАПАЦЕНКА, антраполаг гастранаміі, ганаровы сябра і дарадца Гільдыі шэф-кухараў Беларусі

На здымку: кадр з фільма "Гісторыя беларускай страўні", кансультантам да якога выступіла аўтар.

А як у нас?

На тэрыторыі Беларусі папулярнасць тэфтэляў пачала падарожжа "ў народ" са сталоў шляхты. Ізноў Радзівілы? Гэты факт падаецца крыху прыцягнутым за вушы: гэта магло датычыцца прадстаўніка любога знатнага роду, схільнага да падарожжаў або наняўшага замежнага кухара. Не трэба забывацца на тое, што з XIV стагоддзя (а гэта час кіравання вялікага князя Вітаўта) на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага меліся буйныя татарскія пасяленні, якія маглі падзяліцца рэцэптам эканомнай стравы.

Выпадковая сустрэча

"20 гадоў пасля перамогі"

"Думкі, якія маюць велізарныя наступствы, — заўсёды простыя..." Гэтыя словы належаць Льву Талстому. Думка не новая — гісторыкі шукаюць яе вытокі ў старажытнасці. А ажыццяўленне думак і ёсць наша жыццё.

У 1989 годзе Косця Юданаў суправаджаў групу галандскіх мастакоў на Байкал, у Бурацію. Юданаў, жыхар Беларусі, падумаў, што прырода Бурацыі больш прыдатная для аздараўлення дзяцей, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы, чым паездкі на Захад. І не памыліўся. Эканамісты падлічылі, што на лячэнне аднаго дзіцяці ў Еўропе затрачваецца сума, на якую 60 дзяцей могуць наведаць Бурацію.

Пару нумароў таму "К" распавяла пра сустрэчу з Жаннай Марыяй Дрысен, якая стаіць ля вытокаў акцыі "Байкал — дзецям". Адбылося тое выпадковае знаёмства проста на прыступках Дома-музея I З'езда РСДРП. У 1990 годзе ў Амстэрдаме пры ўдзеле спадарыні Дрысен быў праведзены аўкцыён дзіцячых малюнкаў. На выручаныя сродкі першая група дзяцей з Лельчыцкага, Пінскага раёнаў і з Мінска — усяго 84 чалавекі ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў — адправілася на Байкал.

Суправаджалі групу сужэнцы Барушкі, Вадзім і Наталля, і, вядома ж, сама Жанна Марыя Дрысен.

— Гэта была казачная паездка! — успамінае Наталля Барушка. — Дзеці атрымалі комплекс працэдур тыбецкай медыцыны (біяэнергетычны масаж, іголкаўколванне, мануальную тэрапію) і асабліва — шмат асабістай увагі…

Адзін эпізод запомніўся надоўга. Наш аўтобус па дарозе ва Улан-Удэ зламаўся, мы чакалі падмогі. У гэты час спыніўся картэж з сямі машын, і з галоўнай машыны (гэта была "Чайка") выйшаў чалавек у чырвоным манаскім убранні. Гэта быў Далай-лама XIV. Ён падышоў да нас і, даведаўшыся аб праблеме, зрабіў знак тым, хто яго суправаджаў, а сярод іх былі кіраўнікі Бурацыі. Атрымаўшы блаславенне Далай-ламы, мы неўзабаве займелі спраўны аўтобус і прадоўжылі падарожжа…

Сярод дзяцей, якія наведалі Байкал у 1991 годзе, быў Аляксей Агеенка (на здымку). Цяпер ён — вядучы аператар тэлекампаніі "Мір".

— Мне было дзесяць гадоў. Такая далёкая паездка была для мяне першай і, можа быць, колькасць уражанняў ад падарожжа вызначыла выбар прафесіі…

Спадарыня Дрысен паказала фотаальбом, які яна выпусціла дваццаць гадоў таму.

— Хачу выдаць новы альбом. Не ведаю, як яго назаву. Можа быць, "20 гадоў пасля перамогі". Мае сустрэчы з дзецьмі я апісваю ў кароткіх апавяданнях, суправаджаючы іх фатаграфіямі…

Жанна Марыя Дрысен — доктар філасофіі і літаратуры. Ейныя працы ў даследаванні гуманітарнага выхавання і гуманітарнай дапамогі заслугоўваюць увагі сучаснікаў.

Юрый ІВАНОЎ

На здымках: Жанна Марыя Дрысен з фота дваццацігадовай даўніны; Жанна Марыя з Аляксеем Агеенкам і Наталляй Барушка. Фота аўтара



Зігмунд Мінейка: паміж Беларуссю і Грэцыяй

Неверагодныя прыгоды ашмянскага Монтэ-Крыста

Сям'я Мінейкаў — са старажытнай шляхты. Бацька — Станіслаў Ежы Мінейка — памёр у 1856 годзе, калі Зігмунду споўнілася шаснаццаць. Маці Цэцылія Шчановіч (Мінейка) пражыла да 1900 года, паспеўшы адчуць смак еўрапейскай папулярнасці свайго сына. У Зігмунда былі старэйшая за яго на пяць гадоў сястра Альбярціна, якая адыграла пэўную ролю ў жыцці нашага героя, і брат Яўстафій, што з дзяцінства пакутаваў на хваробу вачэй. Атмасфера ў сям'і была дзіўная: бацька — сапраўдны "дысідэнт", жорсткі праціўнік расійскай палітыкі ў адносінах да палякаў, беларусаў, літоўцаў, які не мог дараваць крыўды за знішчэнне незалежнасці Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. У сваім маёнтку Балванішкі ён часта, употайкі ад паліцыі, збіраў аднадумцаў і распрацоўваў праекты будучых рэвалюцыйных змен. Зразумела, усё гэта адбывалася на вачах дзяцей, якія адпаведна ўспрымалі радыкальныя ідэі дарослых.

(Працяг. Пачатак у № 35,36.)



Фотапартрэт Зігмунда Мінейкі.

Здараліся і нечаканыя жандарскія вобыскі ў пошуках сакрэтных дакументаў у кватэры Мінейкаў, але ўсё абыходзілася добра. Толькі аднойчы гаспадар дома ледзь не трапіў у пераплёт. Уратаваў маленькі Зігмунд, які, каб збіць з панталыку жандараў, выдаў бацькоўскае "тайнае месца": там захоўваліся кантрабандныя сігары. Бацька абышоўся штрафам...

У сваіх няскончаных успамінах, напісаных у 1919 годзе, Зігмунд Мінейка шмат пра гэта апавядае, акцэнтуючы ўвагу на тым, што без маральнага ўплыву бацькі ён не стаў бы тым, кім стаў — на ўсё жыццё, — праціўнікам расійскай кароны. Пазней, у Пецярбургу, гэтае пачуццё яшчэ больш узмацнілася, асабліва пасля сустрэч з польскімі ды беларускімі ўніверсітэцкімі студэнтамі-землякамі, якія гуртаваліся вакол Канстанціна Каліноўскага. На жаль, мемуары Мінейкі, што ахопліваюць перыяд 1848 — 1868 гадоў, да гэтага часу так і не перакладаліся на беларускую ці рускую мову.

Першыя веды юны Зігмунд атрымаў ад хатніх настаўнікаў. Потым яго сталі рыхтаваць да вучобы ў кадэцкім корпусе, якія тады на тэрыторыі Беларусі існавалі ў Полацку і Брэст-Літоўску. Трэба было выбіраць, у які паступаць. Гэта з'яўлялася абавязковай умовай тагачаснага ўрада імперыі, калі адзін з сыноў кожнай дваранскай сям'і мусіў прыняць прысягу расійскай кароне, прайсці вучобу і службу ў расійскай арміі. Інакш сям'я магла страціць усе шляхецкія прывілеі.

Але калі бацькі Мінейкі даведаліся падрабязна пра тую жорсткую атмасферу, што панавала ў гэтых установах, уключаючы цялесныя пакаранні, вынішчэнне ўсіх слядоў нацыянальнай ідэнтычнасці і забарону гаварыць на беларускай і польскай мовах, яны сталі думаць, як выйсці з гэтага становішча. Паколькі Зігмунд быў яшчэ вельмі малы (не споўнілася і дзесяці гадоў), улады ўсё ж дазволілі яму пакуль павучыцца ў гімназіі, а пасля — прысвяціць сябе вайсковай справе на карысць імперыі.

Бацькі вырашылі: віленская гімназія, а там будзе бачна... У Еўропе ўжо наспявала моцная рэвалюцыйная сітуацыя (Францыя, Венгрыя, Германія), якая набліжалася і да Паўночна-Заходняга краю. Ды і падзеі паўстання 1830 года яшчэ не сцёрліся з памяці патрыётаў…

"Мне давялося развітацца з маім домам і сям'ёй ва ўзросце дзевяці гадоў", — пісаў Зігмунд. У Вільню на конным экіпажы яго суправаджалі бацькі і сястра Альбярціна. Уся паездка з-за дрэннай дарогі доўжылася аж тры дні, хаця шлях ад Ашмян да Вільні пры спрыяльных умовах можна было прайсці за дзесяць гадзін. Уладкаваўшы сына ў нямецкую школу-інтэрнат, бацькі вярнуліся дадому, каб сабраць ураджай. А хутка Зігмунд перабраўся жыць да віленскага дзядзькі Ёзафа Мінейкі.

Такім чынам, як і большасць шляхецкіх дзяцей, Зігмунд, яшчэ пры жыцці бацькі, у 1851 г. апынуўся ў Першай Віленскай гімназіі, дзе пазнаёміўся са сваім земляком з фальварка Свіраны Віленскага павета і аднагодкам Францішкам Багушэвічам. Навучаўся разам з Б.Барэйшам, К.Гірдвоінам, К.Юрагам, А.Шарскім, І.Ахматовічам, І.Бярнацкім, Г.Барановічам, але гэтыя імёны сёння мала каму вядомыя. Сярод сяброў Зігмунд згадвае нейкіх братоў Янушкевічаў, Юсевіча, Завадскага, Ваньковіча, Свянціцкага, Янкоўскага. Трошкі раней гэтую ж гімназію скончыў стрыечны брат Зігмунда — Герард, пра якога гаворка ішла вышэй. Вучоба давалася Мінейку лёгка, асабліва замежныя мовы — французская і нямецкая, — а вось з рускай спачатку былі цяжкасці. Дзіўна, але — так, калі верыць ягоным мемуарам...

Дакладна не ведаю, колькі гадоў правучыўся тут Зігмунд. "Кінуў гімназію незадоўга да канца навучальнага года, — піша Мінейка. — Мне быў патрэбен час, каб падрыхтавацца да ўступнага экзамена ў Пецярбургскае ваенна-інжынернае вучылішча. Там гімназічны атэстат быў не патрэбен: у вучылішча прымалі толькі па выніках уступных экзаменаў".

Ішоў верасень 1858 года. Пасля смерці бацькі (у 1856-м) Зігмунду ў складаных жыццёвых сітуацыях давялося разлічваць толькі на маці, жанчыну мужную, актыўную, самадастатковую, якая потым неаднойчы ўратоўвала Зігмунда ад буйных непрыемнасцей. Дапамагла, канешне ж, і пратэкцыя тагачаснага генерал-ад'ютанта, героя Севастопальскай абароны, ваеннага інжынера, графа Эдуарда Татлебена. Справа ў тым, што капітан Аляксандр Тыдман, стрыечны брат Татлебена, быў мужам... Альбярціны, той самай старэйшай сястры Зігмунда. Адсюль, так бы мовіць, роднасныя сувязі Мінейкаў і Татлебенаў. Дарэчы, Татлебен адзін час, з 1880 па 1884 гг., быў генерал-губернатарам Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў (пасля сумна вядомага Міхаіла Мураўёва).

Да Пецярбурга Зігмунд разам з Аляксандрам Тыдманам дабіраўся на паштовай карэце: праз Свянцяны, Дзінабург, Віцебск, Пскоў. У апошнім кінулі карэту і купілі ўласны камфортны тарантас. А ў горадзе Луга Зігмунд упершыню пабачыў цягнік!..

У Пецярбургу юнак пазнаёміўся з Татлебенам і ягонай сям'ёй, і ў першы ж вечар, пасля суботняй вячэры, скарыў усіх, асабліва дзяўчат і кабет, уменнем цудоўна танцаваць мазурку. "Я адчуваў сябе чалавекам, які ператварыўся з вясковага юнака ў новага Казанову, — пісаў Зігмунд. — Я прывёз у Санкт-Пецярбург зусім новыя варыяцыі мазуркі — аднаго з самых складаных танцаў". Пасля гэтага вечара Тыдман вярнуўся на службу ў армію, а потым, атрымаўшы званне палкоўніка, стаў камендантам крэпасці ў Рэвелі.

Трэба сказаць, што перад тым, як паступаць непасрэдна ў вучылішча, неабходна было прайсці, так бы мовіць, падрыхтоўчыя курсы ў платнай прыватнай школе, якую ўзначальваў нехта інжынер-маёр Іваноў. Там выкладалі азы тых прадметаў, па якіх здавалі экзамены ў вучылішчы. Толькі не было прадмета статыстыкі. І Зігмунду давялося — за адну ноч! — самастойна вывучыць гэтую дысцыпліну з дапамогай канспекта аднаго курсанта-фіна, які быў на другім курсе вучылішча. Па выніках экзаменаў Зігмунд стаў трэцім у спісе лепшых абітурыентаў.

А хутка Эдуард Іванавіч Татлебен прадставіў 18-гадовага Зігмунда патрону вучылішча — самому імператару Аляксандру II. Кажуць, што цар перакінуўся з юнаком з Ашмян некалькімі фразамі і задаволена ўсміхнуўся: хлопец яму спадабаўся. Ведаў бы ён, якога "ворага імперыі" прытуліў у Пецярбургу! У дзённіку імператарскага генерал-ад'ютанта захаваўся запіс: "Маленькі ліцвін у пачатку гутаркі быў занадта нясмелым, напрыканцы ж — занадта храбрым. Увогуле, як і ўсе ўраджэнцы Паўночна-Заходняга краю". Гэта была першая — і не апошняя — сустрэча Зігмунда з імператарам.

Мікалаеўскае ваенна-інжынернае вучылішча, дзе вучыўся Зігмунд Мінейка.

Гэтае вучылішча ў тыя часы, мабыць, было адным з самых прэстыжных па сваёй дзяржаўнай значнасці на прасторы Расійскай імперыі. У 1819 годзе па ініцыятыве Мікалая I яно было пераўтворана са звычайнай Інжынернай школы ў вышэйшую навучальную ўстанову "для адукацыі ўмелых інжынераў і сапёрных афіцэраў" ды асталявалася не дзе-небудзь, на нейкай гарадской ускраіне, а ў самім Міхайлаўскім замку — апошняй рэзідэнцыі няшчаснага Паўла I. Дарэчы, у двух асабістых пакоях імператара, у адным з якіх яго забілі, была ўстаноўлена так званая Малая царква на 250 чалавек, асвячоная ў гонар апосталаў Пятра і Паўла.

Спачатку Зігмунд быў вельмі задаволены вучылішчам, якое магло даць яму добрую прафесійную адукацыю і "магчымасць мець светлую будучыню". Акрамя таго, быў уратаваны статус прыналежнасці сям'і Мінейкаў да шляхецтва. Зігмунд вучыўся на інжынерным аддзяленні (працавала яшчэ адно — кандуктарскае), дзе вывучаў фартыфікацыю, картаграфію, аналітычную геаметрыю, фізіку, механіку, грамадзянскую архітэктуру, будаўнічае мастацтва — навукі, якія яму потым вельмі прыдаліся ў жыцці за мяжой, асабліва ў Балгарыі ды Грэцыі. Шмат займаўся фехтаваннем і стральбой. Шмат чытаў пры газавай лямпе ды свечках (электрычнасці тады яшчэ не было). Аднойчы ж на цэлыя два тыдні да яго ў Пецярбург прыехала пагасцяваць маці Цэцылія…

Улетку 1859 года пад Пецяргофам прайшлі ваенныя зборы курсантаў вучылішча з удзелам імператара. На гэтых зборах Зігмунд захварэў на жаўтуху, і яго ў палатачным лазарэце наведаў Аляксандр II. Ён прыгадаў тую першую сустрэчу, даведаўся пра здароўе юнака і пажадаў яму хутчэй папраўляцца.

Калі б Мінейка скончыў вучылішча, ён мог бы стаць афіцэрам, перайсці ў новаўтвораную Ваенна-інжынерную акадэмію і даслужыцца, як і многія, да генеральскага звання, а гэта азначала блізкасць да трона і добрую матэрыяльную забяспечанасць. Альбо Зігмунда маглі пакінуць у якасці выкладчыка ў Акадэміі, куды ў 1855-м увайшлі аддзеленыя ад вучылішча чыста афіцэрскія класы.

Самым знакамітым настаўнікам Мінейкі быў Міхаіл Астраградскі — матэматык і механік, лідар рускай матэматычнай школы сярэдзіны XIX стагоддзя. Сярод іншых педагогаў — генерал ад інфантэрыі, прафесар ваенна-інжынернага мастацтва Генрых Леер, выдатны знаўца фартыфікацыі, ды Аляксандр Квіст — генерал-маёр, таксама вучоны-фартыфікатар. Менавіта яны найбольш паўплывалі на Зігмунда ў тэорыі спазнання палявой фартыфікацыі, будаўніцтва чыгунак і перавозак на іх войскаў, будаўніцтва ўмацаваных лагераў, крэпасцей, пантонных паркаў, абарончых ліній ды іншых сродкаў інжынернай творчасці ва ўмовах вайны. Гэтыя веды вельмі прыдаліся Зігмунду, калі ён праз паўстагоддзя змагаўся з туркамі за незалежнасць Грэцыі, дзякуючы чаму і стаў нацыянальным героем гэтай краіны.

А з кім разам вучыўся Зігмунд?..

(Працяг будзе.)

Барыс КРЭПАК

а•ф•і•ш•а «К»

З 14 ВЕРАСНЯ — ДА 21 ВЕРАСНЯ

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- **"Слуцкія паясы"** (са збору Львоўскага гістарычнага музея) — да 18 красавіка 2014 г.
- **"З мінулага ў будучыню"** — да 30 верасня.
- Выстаўка адной карціны ў рамках святкавання Дня горада ў Нацыянальным мастацкім музеі — **"Вера — гэта дар Божы".**
- **"Родам з мястэчка"**, выстаўка, прысвечаная 90-годдзю Шымона Перэса і 100-годдзю Менахема Бегіна, — да 30 верасня.
- Міжнародная выстаўка **"Праваслаўны свет. Вобраз Хрыста ў іканаграфіі краін Усходняй Еўропы"** — да 5 снежня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22. z

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь"**.
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
- **"Водбліскі ваеннай славы"**.
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст."**.

Выстаўкі:
- **"У промнях веры хрысціянскай"**.
- **"Выратаваныя каштоўнасці"** (сумесна з філіялам Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея — музеем "Выратаваныя мастацкія каштоўнасці") — да 15 верасня.
- **"Скарбы Беларусі"**.
- **"Камунальная кватэра"**.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.

- Выстаўка **"Палескае мястэчка: Моталь"** (фотаздымкі першага мотальскага фатографа Аляксея Мінюка, а таксама "Рэчы з мястэчак" з прыватных збораў Ірыны Кахановіч).

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- Фотавыстаўка **"Мір стары — Мір новы"** .
- Выстаўка **"Наваградскі край вачыма Канута Русецкага. З альбома 1844 — 1846 гг."** — да 30 верасня.
- Выстаўка аўтарскіх лялек **"Малая гасцёўня"** — да 31 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

Выстаўкі:
- Музейна-педагагічны праект для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту **"Крочым у школу разам з Коласам"** (заяўкі прымаюцца па тэлефоне: +375 (17) 284-17-02) — да 27 верасня.
- Выстаўка **"Вучні Якуба Коласа"** з фондаў музея — да 30 верасня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а.
Тэл: 226 03 98.

Выстаўкі:
- **"Партызанскі лагер"**.
- Мастацкая выстаўка **"Мінск — ведаць, памятаць, ганарыцца"** (да Дня горада Мінска).

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.
Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- Старажытнарускае шыццё XV — XVIII стст. са збораў Разанскага гісторыка-архітэктурнага музея-запаведніка **"Жывапіс іголкай"** — да 6 кастрычніка.
- Мастацкая выстаўка **"Нацюрморт. Паэма быцця"** — да 24 лістапада.
- Выстаўка жывапісу Анатоля Отчыка **"На бранскай зямлі"**, прысвечаная 1025-годдзю Хрышчэння Русі, — да 6 кастрычніка.
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
- **"Радкі, імёны, лёсы"** (выстаўка літаратуры к. XIX — пач. XX стст. са збору князёў Паскевічаў).
- **"Класікі беларускага мастацтва"** (выставачна-адукацыйны праект).

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 32.
Тэл.: (8-0232) 74-28-23.

Экспазіцыі:
- Інтэр'еры гарадскога асабняка к. XIX — пач. XX стст.
- Прагулкі па старым Гомелі.
- Гісторыя Гомеля ад старажытнасці да пачатку XX ст.

Выстаўкі:
- Фотаапараты і фотатэхніка XX ст. (каля 100 адзінак, перададзеных у дар Музею гісторыі г. Гомеля Леанідам Пінскім).
- **"Дрэва добрае"** (да 1025-годдзя Хрышчэння Русі).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Скрозь агонь баёў"**.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 22 44.

- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны"**.
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60"**.
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс.: 290 60 10.

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 327 88 78.

- Пастаянныя экспазіцыі: **"Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**
- Выстаўка адной карціны Адама Шэмеша **"Партрэт Людвіка Кандратовіча (Уладзіслава Сыракомлі). 1854"** (са збору Літоўскага мастацкага музея).
- **"Аўтапартрэт"** Валенція Ваньковіча.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка В.Паўленка **"Той абрус, што мама вязала"**.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 5 51 81, 5 31 96, 2 06 02

Палацавы ансамбль:
- Выстаўка гадзіннікаў **"Падарожжа ў часе"** (унікальныя калекцыі хранометраў XVIII — XX стст. — ад камінных да наручных з Музея гадзіннікаў (Клайпеда) і калекцыі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля) — да 25 верасня.
- Выстаўка **"Якуб Колас і Аляксандра Каліна. Гісторыя знаёмства і перапіскі"** — да 30 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
- Культурна-адукацыйныя праекты, прысвечаныя культурнай спадчыне святых Кірылы і Мяфодзія.
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
- Выстаўка **"У сэрца глянь сваё..."** з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.
- Інтэрактыўная гульня **"У пошуках папараць-кветкі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
- Выстаўка **"Былое ў думках ускрашаць..."**, прымеркаваная да 100-годдзя напісання Янкам Купалам рамантычных паэм.
- Выстаўка **"Чароўны свет тэатра і казкі"**, прысвечаная паўвекавой дзейнасці Гомельскага дзяржаўнага тэатра лялек, — да 3 лістапада.
- Мастацкія творы Анжалікі Шабалтас **"Вострaў белых птушак"** — да 22 верасня.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- "Зала ўрачыстых прыёмаў".

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

г. Гродна, вул. Замкавая, 16.
Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
- **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
- **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўка:
- **"Таямнічая сіла крыжа"**
- Юбілейная выстаўка **"Віталь Цвірка. 100..."** — да 18 верасня.
- Выстаўка Творчай секцыі "Верасень" Беларускага саюза мастакоў — да 18 верасня.

ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

- **"Profectus"** — выстаўка дыпломных работ выпускнікоў Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К. Глебава.
- **"Без межаў"** — выстаўка работ Надзеі Бука.

ТЭАТР

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.

- **15 — "Тоска"** Дж.Пучыні.
- **16 — "Жызэль, або Вілісы"** А.Адана.
- **17 — "Травіята"** Дж.Вердзі.
- **18 — "Трыстан і Ізольда"** Р.Вагнера.
- **18 — "Шапэніяна"** Ф.Шапэна.
- **18 — "Балеро"** М.Равеля.
- **19 — "Мадам Батэрфляй"** Дж.Пучыні.
- **20 — "Лебядзінае возера"** П.Чайкоўскага.
- **20 — "Шэдэўры оперы"** (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай).

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

- **17 — "Тры Жызэлі"** А.Курэйчыка.
- **18 — "Сталіца Эраўнд"** С.Гіргеля.
- **19 — "Бегчы з Эльсінора, або Гамлет навыварат"** В.Понізава.
- **20 — "Купала. Кругі раю"** С.Навуменка.
- **21 — "Нязваны госць"** С.Бартохавай.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

- **15 — "Чароўная лямпа Аладдзіна"** М.Самойлава.
- **15 — "Аднойчы ў Чыкага"** Дж.Стайна, Г.Мілера.
- **16 — "Сільва"** І.Кальмана.
- **17 — "Лятучая мыш"** І.Штраўса.
- **18 — "Мая жонка — ілгуння"** В.Ільіна, В.Лукашова.
- **19 — "12 крэслаў"** Г.Гладкова.
- **20 — "Містар Ікс"** І.Кальмана.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл./факс: 227 60 81.

- **14 — 15 — "Людзі на балоце"** І.Мележа.
- **19 — 21 — "Местачковае кабарэ"** паводле твораў М.Хемара, Ю.Тувіма, Л.Дэнца, Дж.Расіні, В.Шалкевіча.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ

Рэдакцыя:
Дзмітрый ФІЛІПОВІЧ (адказны сакратар)

Рэдактары аддзелаў:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН

Спецкарэспандэнт:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ

Загадчык аддзела фотаілюстрацый —
Юрый ІВАНОЎ

Мастацкі рэдактар —
Наталля ОВАД

Карэктар —
Інга ЗЕЛЬГІС

Адрас рэдакцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны:
(017) 290 22 50,
(017) 286 07 97,
(017) 334 57 23
Тэлефон-факс:
(017) 334 57 41
Рэкламны аддзел:
тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by

E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2013.
Індэксы 63875, 638752
Кошт 4500 рублёў.
Наклад 6 773
Падпісана ў друк 13.09.2013 у 16.30
Замова 3759
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.
Выдавец —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Прыёмная: (017) 290 22 50.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35

QR-код: